РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

29 студзеня 2025 г. СЕРАДА № 19 (30407)



## БЛІЗКІЯ ПАРТНЁРЫ З «ДАЛЁКАЙ ДУГІ»

**Прыезд прадстаўнічай афрыканскай дэлегацыі не абмежаваўся назіраннем за выбарамі. Учора ў Палацы Незалежнасці гаварылі не толькі пра электаральную кампанію, але і пра перспектывы супрацоўніцтва.**

(Працяг на 2 стар.)

ДОБРАЯ НАВІНА

# ЧАКАНЫЯ ПАВЫШЭННІ

### З лютага вырастуць дапамогі на дзяцей і «ўзроставыя» даплаты да пенсій



Сацыяльная палітыка была адной з прыярытэтных мэт перадвыбарнай праграмы Прэзідэнта краіны Аляксандра Лукашэнкі. Ёй заўсёды ўдзялялася і ўдзяляецца вялікая ўвага ў нашай дзяржаве. Рэалізацыя ініцыятыў па падтрымцы ўразлівых катэгорый насельніцтва працягнецца. З 1 лютага павялічацца памеры дзяржаўнай дапамогі сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей.

Як паведамілі ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны, дапамогі, якія вылічваюцца з бюджэту пражытачнага мінімуму, узрастуць на 2,2 працэнта. Такім чынам, аднаразовая дапамога пры нараджэнні першага дзіцяці складзе 4 476,40 рубля, пры нараджэнні другога і наступных дзяцей — 6 266,96 рубля.

Дапамога жанчынам, якія сталі на ўлік у арганізацыях аховы здароўя да 12-тыднёвага тэрміну цяжарнасці, павялічыцца да 447,64 рубля, а штомесячная дапамога сем'ям на дзяцей ва ўзросце ад 3 да 18 гадоў у перыяд выхавання дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў — да 223,82 рубля. Новыя памеры будуць дзейнічаць з 1 лютага да 30 красавіка гэтага года. Атрымлівае такія дапамогі ў краіне 160,7 тысячы дзяцей.

Павялічваюцца з 1 лютага і «ўзроставыя» даплаты да пенсій, якія атрымліваюць амаль 540 тысяч чалавек ва ўзросце 75 гадоў і старэйшых. Іх памер вырасце на 2,2 % і складзе 83,93 рубля для людзей ва ўзросце 75—79 гадоў (пры наяўнасці інваліднасці I групы — 195,84 рубля) і 167,87 рубля для 80-гадовых і старэйшых асоб (з улікам надбаўкі на догляд), а пры наяўнасці інваліднасці I групы — 223,82 рубля.

СТАР. 5

ДАЕШ АРЭНДНАЕ ЖЫЛЛЁ! ДЗЕЛЯ ЧАГО? КАМУ?



Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ISSN 1990 — 763X

НАВУКА

# НА КРАІ ЗЯМЛІ

### Якія таямніцы адкрывае Беларусь на «лядовым кантыненце»

Антарктыка — малавывучаны рэгіён планеты. Чалавецтва даследавала толькі частку ўзбярэжжа, а большасць унутрыкантынентальных і многія прыбярэжныя тэрыторыі вялізнага (больш чым у 60 разоў перавышаючага Беларусь па плошчы) «лядовага кантынента» і сёння застаюцца terra incognita. Цяпер там працуе 17-я Беларуская антарктычная экспедыцыя.



СТАР. 11

# «НАША СУПРАЦОЎНІЦТВА З КРАІНАМІ

## Акцэнты размовы кіраўніка дзяржавы з членамі Панафрыканскага парламента

Працягваецца серыя сустрэч Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з замежнымі гасцямі. У аўторак беларускі лідар сустрэўся з дэлегацыяй Панафрыканскага парламента на чале са старшынёй Фарчунам Зефаніям Чарумбірам. Дэлегацыя працавала назіральнікамі на выбарах Прэзідэнта. А паколькі Беларусь актыўна пашырае сваю прысутнасць у Афрыцы, электаральнай кампаніяй размова з кіраўніком дзяржавы не абмежавалася. Тым больш, як звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка, гэта першы візіт такой прадстаўнічай дэлегацыі Панафрыканскага парламента ў нашу краіну.



Фота БелТА.

«Прызнацца, я даўно сачу за развіццём адносін паміж нашымі парламентамі. Павінен адзначыць, што менавіта пад вашым старшынствам, спадар Чарумбіра, узаемадзеянне стала больш актыўным, — адзначыў беларускі лідар. — Тое, што мы рушылі наперад у наладжванні супрацоўніцтва, для мяне нядзіўна. Бо вы, спадар старшыня, — зімбабвіец, а значыць, прадстаўнік вельмі дружалюбнай нам дзяржавы. Прашу вас па вяртанні перадаць самыя цёплыя пажаданні майму сябру Прэзідэнту Зімбабвэ Эмерсану Мнангагву. Чакаем яго з візітам у Мінску сёлета. І, калі вы прыедзеце з ім, мы таксама будзем рады».

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што Беларусь падтрымлівае партнёраў з Афрыкі ў іх імкненні выпрацоўваць свае прадукты харчавання за кошт унутраных рэсурсаў і быць незалежнымі ад знешніх фактараў. «Рабіць гэта мы будзем не толькі за кошт паставак нашай прадукцыі, але і за кошт перадачы вам тэхналогій і стварэння там адпаведных прадпрыемстваў», — сказаў ён. Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што з 2020 года Зімбабвэ сумесна з Беларуссю паспяхова ажыццяўляе праграму механізацыі сельскай гаспадаркі. «Вы павінны быць упэўненыя, што мы будзем працягваць свой рух, калі вам гэта будзе выгадна», — запэўніў ён. За два гады дзеяння праграмы, пра якую казаў Прэзідэнт, дзякуючы пастаўкам амаль дзвюх тысяч трактароў і камбайнаў, Зімбабвэ ў 2022 годзе ўпершыню за апошнія 50 гадоў поўнасцю забяспечыла сябе зернем.

Прэзідэнт звярнуў увагу, што цікавасць да беларускага вопыту развіцця аграсектара ёсць у Егіпта, Алжыра, Мазамбіка, Эфіопіі, Кеніі, Нігерыі і іншых дзяржаў. Ён запрасіў афрыканскія профільныя дэлегацыі на міжнародную спецыялізаваную выстаўку сельскагаспадарчай прадукцыі «Белагра» ў Мінску ў чэрвені гэтага года.

### «МЫ МОЖАМ ЗРАБІЦЬ СВОЙ УНЁСАК У РЭАЛІЗАЦЫЮ ГЭТЫХ ВАЖНЫХ ЗАДАЧ»

«У цэлым наша супрацоўніцтва з краінамі Афрыкі выглядае шматабяцальным. Мы бачым цікавасць і з вашага боку. Невыпадкова да сённяшняй сустрэчы далучыліся прадстаўнікі розных рэгіёнаў Афрыканскага кантынента», — адзначыў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ў Беларусі надаюць вялікае значэнне развіццю ўсебаковага партнёрства з Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікай. Гэта датычыцца здабычы карысных выкапняў, узаемадзеяння ў сферах энергетыкі, сельскай гаспадаркі, навукі і адукацыі. «Важнае месца займае праект па зборачнай вытворчасці трактароў на аснове беларускіх тэхналогій», — заўважыў беларускі лідар. Дарэчы, за студзень — лістапад 2024 года тавараабарот паміж Беларуссю і Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікай склаў 28 мільёнаў долараў.

Беларуска-кенійскія адносіны таксама ўпэўнена развіваюцца. «У канцы 2023 года ў мяне адбыліся вельмі канструктыўныя сардэчныя, сяброўскія перагаворы ў Найробі з Прэзідэнтам Кеніі Уільямам Руто. Спадзяюся на наша далейшае ўзаемадзеянне. Я афіцыйна запрасіў Прэзідэнта Кеніі наведаць Беларусь з візітам і чакаю яго ў любы зручны час. Ведаю аб зацікаўленасці Кеніі ў забеспячэнні харчовай бяспекі, развіцці прамысловасці. Мы можам зрабіць свой унёсак у рэалізацыю гэтых важных задач», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Як заўважыў кіраўнік дзяржавы, адносіны паміж Беларуссю і Каба-Вердэ пакуль не маюць актыўнага характару. «Але ў апошнія гады мы ўдзяляем вялікую ўвагу Заходняй Афрыцы. У рэгіёне рэалізоўваецца шэраг перспектыўных праектаў у галіне сельскай гаспадаркі, аховы здароўя, барацьбы з надзвычайнымі сітуацыямі. Разлічваю, што ваш прыезд у Мінск надасць імпульс далейшым кантактам», — падкрэсліў беларускі лідар, звяртаючыся да прадстаўніка гэтай краіны.

### «СПАДЗЯЮСЯ, ВАМ УДАЛОСЯ ЎБАЧЫЦЬ НАШЫ МАГЧЫМАСЦІ»

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу і на работу дэлегацыі Панафрыканскага парламента на прэзідэнцкіх выбарах. «Думаю, вы заўважылі, што гэта палітычная кампанія не парушыла спакойнага рытму работы краіны. Выбары прайшлі на высокім арганізацыйным узроўні, без узрушэнняў, як некаторыя на Захадзе чакаюць, — адзначыў

# «ЦВЁРДАЯ ПАДТРЫМКА БЕЛАРУСКАГА НАРОДА»

## На адрас Аляксандра Лукашэнкі працягваюць паступаць віншаванні з розных куткоў свету з нагоды перамогі на прэзідэнцкіх выбарах

«В'етнам заўсёды ўважліва сочыць і з задавальненнем назірае за поспехамі, якіх дасягнуў пад вашым кіраўніцтвам беларускі народ у справе сацыяльна-эканамічнага развіцця і ўмацавання міжнародных пазіцый краіны, — гаворыцца ў віншаванні **Прэзідэнта В'етнама Льонга Кьонга.** — В'етнам надае вялікае значэнне ўмацаванню і развіццю традыцыйнага сяброўства з Беларуссю і перакананы, што дзякуючы рашучасці лідараў і народаў дзвюх краін шматграннае супрацоўніцтва паміж В'етнамам і Беларуссю будзе і ў далейшым прыносіць яшчэ больш вынікаў у імя агульных інтарэсаў двух народаў, у імя міру, стабільнасці і развіцця ў рэгіёне і свеце».

***

Павіншаваў Аляксандра Лукашэнку з перамогай на выбарах **Прэзідэнт Туркменістана Сердар Бердымухамедаў.** У віншаванні гаворыцца, што Туркменістан надае вялікае значэнне далейшаму развіццю двухбаковага супрацоўніцтва, якое традыцыйна грунтуецца на прынцыпах раўнапраўя, узаемнай павагі і даверу. «Глыбока перакананы, што пад Вашым мудрым і дальнабачным кіраўніцтвам Рэспубліка Беларусь дасягне яшчэ большых поспехаў, а нашы міждзяржаўныя адносіны выйдуць на якасна новы ўзровень», — адзначана ў віншаванні.

***

**Прэзідэнт Кубы Мігель Дыяс-Канэль Бермудэс** у сваім віншаванні адзначыў, што перамога Аляксандра Лукашэнкі на выбарах пацвярджае моцную падтрымку беларускім народам яго кіраўніцтва, накіраванага на развіццё і дасягненне дабрабыту краіны.

***

Прыйшло віншаванне і з **Нікарагуа — ад Прэзідэнта Хасэ Даніэля Артэгі Сааведры** і віцэ-прэзідэнта Расарыё Мурыльё. У ім перамога Аляксандра Лукашэнкі названа «гістарычным трыумфам, які пацвярджае, што вы з'яўляецеся Прэзідэнтам свайго мужнага народа, каб працягваць адыгрываць галоўную ролю ў барацьбе за новы, шматпалярны свет справядлівасці, братэрства і павагі».

***

У віншаванні **Прэзідэнта Сербіі Аляксандра Вучыча** выказана ўпэўненасць у тым, што дзяржаўнае майстэрства Аляксандра Лукашэнкі будзе садзейнічаць працвітанню краіны, а таксама развіццю двухбаковых адносін у галінах узаемнай цікавасці. «Асабліва хачу выказаць падзяку Рэспубліцы Беларусь і асабіста вам за прынцыповую пазіцыю і аказаную падтрымку ў пытанні тэрытарыяльнай цэласнасці і суверэнітэту Рэспублікі Сербія», — падкрэсліў сербскі лідар.

МЕРКАВАННІ

# ВЫБАРЫ Ў БЕЛАРУСІ —

Пакуль «вялікія» еўрапейскія эксперты завочна даюць ацэнку нашым прэзідэнцкім выбарам, міжнародныя назіральнікі і незалежная экспертная супольнасць з 52 краін свету, якія гэтымі днямі сачылі за найважнейшай электаральнай падзеяй, расказваюць, як гэта было на самай справе. Яны адзначаюць высокую яўку грамадзян, адкрытасць і даступнасць усіх суб'ектаў электаральнага працэсу, празрыстасць, галоснасць і дэмакратычнасць. Галоўнае, што сваё слова выказаў народ, зрабіўшы выбар на карысць дзеючага кіраўніка дзяржавы, а значыць — за стабільнасць, мірную і светлую будучыню.

На розных пляцоўках эксперты — як міжнародныя, так і айчынныя — даюць ацэнку найважнейшай падзеі пяцігодкі.

### «КУРС НАШАГА ПРЭЗІДЭНТА ПАДТРЫМАНЫ І БУДЗЕ ДАЛЕЙ РЭАЛІЗОЎВАЦЦА»



Як адзначыў у эфіры ток-шоу «Будні» на «Альфа Радыё» **аналітык Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў Аляксей АЎДОНІН,** вельмі высокі працэнт галасоў, якія выбаршчыкі аддалі за Аляксандра Лукашэнку, сведчыць аб вялікай падтрымцы таго курсу, які праводзіць наш палітычны лідар. «Курсу на стабільнасць, павышэнне дабрабыту нашага беларускага народа, — удакладніў эксперт. — Вядома ж, нашы грамадзяне разумеюць сітуацыю, якая складваецца ў нас у рэгіёне (канфлікт на Украіне, мілітарызацыя на заходніх межах), і тое, што, нягледзячы на ўсё гэта ліхалецце, унутры нашай краіны спакойна, — гэта заслуга Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі. Таму я думаю, што высокі паказчык і па яўцы на выбарах, і па выніках галасавання сведчыць аб тым, што курс нашага Прэзідэнта падтрыманы і будзе далей рэалізоўвацца».

# АФРЫКІ ВЫГЛЯДАЕ ШМАТАБЯЦАЛЬНЫМ»

Аляксандр Лукашэнка. — Спадзяюся, вам удалося ўбачыць нашы магчымасці і пераканацца ў гатоўнасці да дыялогу». Кіраўнік дзяржавы пацікавіўся ўражаннямі гасцей ад наведвання Беларусі і прапановамі аб супрацоўніцтве ў канкрэтных галінах. «Вельмі важна нам наладзіць з вамі цеснае супрацоўніцтва. Гэта было б добрым вынікам вашага знаходжання ў Беларусі і сігналам кіраўніцтву вашых краін ды і іншых краін Афрыкі», — падсумаваў беларускі лідар.

Старшыня Панафрыканскага парламента ад імя сваіх калег павіншаваў Аляксандра Лукашэнку з перамогай на выбарах. «Мы лічым, што народ Беларусі выкарыстаў свабодную волю ў выяўленні свайго жадання бачыць вас Прэзідэнтам, і таму я віншую вас з такой перамогай, якая ўражвае. Такая вялікая колькасць галасоў у вашу падтрымку сведчыць аб тым, што народ Беларусі ўпэўнены ў вас, што ён верыць вам», — сказаў Фарчун Зефанія Чарумбіра. Ён падзякаваў кіраўніцтву беларускага парламента за запрашэнне членаў Панафрыканскага парламента, за магчымасць стаць часткай назірання за выбарамі.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

## Дарэчы

**А ў сяброўскім Кітаі сёння — Свята Вясны, Новы год паводле ўсходняга календара.**

**Са святам Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Старшыню Кітайскай Народнай Рэспублікі Сі Цзіньпіна.**

**«Наша краіна была, ёсць і будзе надзейным партнёрам Кітайскай Народнай Рэспублікі ў дасягненні ўсіх пастаўленых мэт. Без сумненняў, у 2025 годзе мы працягнем паступальна і планамерна ўмацоўваць усепагоднае і ўсебаковае стратэгічнае партнёрства, а наша сяброўства будзе эталонам для ўсяго свету», — гаворыцца ў віншаванні.**

## У тэму

Панафрыканскі парламент — гэта кантынентальны парламент. Кожны яго член прадстаўляе мільёны жыхароў розных краін. За некалькі дзён у Беларусі дэлегацыя паспела не толькі папрацаваць на выбарах, але і наведаць прадпрыемствы, сустрэцца з калегамі, каб наладзіць супрацоўніцтва з Беларуссю, так патрэбнае краінам Афрыкі. Пасля сустрэчы з Прэзідэнтам Беларусі яны падзяліліся сваімі ўражаннямі ад наведвання нашай краіны і расказалі, якім бачаць двухбаковае супрацоўніцтва ў самых розных галінах.

### «Беларусь заслугоўвае таго, каб з яе браць прыклад»

**Фарчун Зефанія Чарумбіра, старшыня Панафрыканскага парламента:** «Я абсалютна згодны з ацэнкамі кіраўніка беларускай дзяржавы, што ў цяперашні час адносіны паміж Беларуссю і Афрыканскім кантынентам развіваюцца ва ўсіх галінах. На жаль, вымушаны прызнаць, што мы ў Афрыцы менш ведаем аб краінах постсавецкай прасторы. Так, мы ведаем Расію, але аб іншых краінах ведаем вельмі мала. Нядаўна мы наведвалі з візітам Азербайджан і ўбачылі, што гэта вельмі развітая краіна, якая не саступае ніякай іншай. Тое ж самае датычыцца і Беларусі. Сам я з Зімбабвэ, і я ведаю, што ў Беларусі добра развітая сельская гаспадарка, што наладжана вытворчасць трактароў і аўтобусаў. Але іншага я не ведаў, як не ведалі і мае калегі. У нас не было агульнай карціны. І калі мы прыехалі, наведалі прадпрыемствы, у прыватнасці МТЗ, я пашкадаваў, што мы раней сюды не прыйшлі. Мы наведвалі вашы ўніверсітэты і бачылі, што там вучыцца шмат студэнтаў з Афрыкі. І мы будзем працаваць, каб іх было больш. Працягвайце развіваць сваю адукацыю, гэта вельмі важна.

Што датычыцца выбараў, то мы як парламентарыі назіраем за выбарамі часта. Мы гэта ведаем дасканала. Вашы выбары няма з чым параўнаць. Яны самыя лепшыя і адпавядаюць усім стандартам і дэмакратыі, і транспарэнтнасці. Я вельмі шчаслівы быць тут, для мяне вялікі гонар назіраць за імі.

Беларусь — гэта краіна, якая адправіла жанчыну ў космас. Я думаю, не за гарамі той час, калі беларусы высадзяцца на Месяцы. Беларусь заслугоўвае таго, каб з яе браць прыклад. Гэта ваша сіла, з гэтай сілай трэба лічыцца. Не звяртайце ўвагу на ворагаў, якія нейкім чынам спрабуюць аказваць на вас ціск. Памятайце аб вашай сіле і ідзіце наперад».

### «Абсалютна транспарэнтныя і дэмакратычныя»

**Рэфілвэ Мцвені-Цыпанэ, старшыня Нацыянальнага савета правінцый Парламента Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі,** адзначыла, што гэты візіт у Беларусь на многае адкрыў вочы: «З першай хвіліны нашага знаходжання ў Беларусі мы былі ўражаны тым цёплым прыёмам, які нам быў аказаны на гэтай гасціннай зямлі. Мы бачылі шчырыя ўсмешкі людзей, мы бачылі іх цёплае стаўленне. І мы бачылі, як дэмакратычна, транспарэнтна праводзіліся прэзідэнцкія выбары. Кожнаму была дадзена магчымасць выказаць сваё меркаванне, прагаласаваць. Мы наведвалі розныя ўчасткі, мы нават прысутнічалі пры падліку галасоў і бачылі, што нікога ніяк не прымушалі выказваць сваю волю. Ні на кога не аказвалася ніякага ціску. І таму мы можам спакойна заявіць, што гэтыя выбары былі абсалютна транспарэнтнымі, абсалютна дэмакратычнымі. І мы хацелі б пажадаць кіраўніцтву і народу Беларусі ўсяго найлепшага ў будучыні. Беларусь — сябар для Афрыкі. Я хацела б пажадаць усёй Афрыцы і Беларусі доўгай і трывалай дружбы».

### «Віншую народ Беларусі з тым, што ён перамог»

**Эстэр Мутоні Пасарыс, дэпутат Нацыянальнай асамблеі Рэспублікі Кенія:** «Найперш я хацела б павіншаваць народ Беларусі з тым, што ён перамог. Ён выбраў Прэзідэнта, якога ён любіць, якому давярае, у якога верыць і з якім гатовы ісці далей для дасягнення новых вяршынь. На сустрэчы з Прэзідэнтам я ўбачыла чалавека вельмі спакойнага і ўраўнаважанага, чалавека, які вельмі дакладна разумее, што трэба рабіць. Я памятаю яго візіт у нашу краіну ў 2023 годзе. Тады і цяпер ён сказаў, што паміж нашымі краінамі няма закрытых тэм. І мы гатовы працаваць разам, гатовы разам расці і выбудоўваць нашы эканамічныя і іншыя сувязі для таго, каб зрабіць жыццё нашых народаў яшчэ лепш.

### Выбары прайшлі свабодна

**Ліма Карла Салангэ Фортэс, дэпутат Нацыянальнай асамблеі Рэспублікі Каба-Вердэ:** «Выбары ў Беларусі прайшлі свабодна, людзі маглі выказаць сваю волю, агульная абстаноўка была спакойнай. Я хачу павіншаваць беларусаў з гэтым». Што датычыцца супрацоўніцтва Беларусі з Каба-Вердэ, на якое звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка, Ліма Карла Салангэ Фортэс расказала, што ў яе краіны былі цудоўныя адносіны з Савецкім Саюзам. «Мы гэта памятаем, але ўзровень адносін знізіўся. Я ў той партыі, якая выступае за аднаўленне нашых адносін, іх паляпшэнне, у прыватнасці ў сферы харчовай бяспекі, што нас турбуе больш за ўсё і ў чым Беларусь дасягнула вялікага поспеху. Нас цікавяць такія сферы, як ахова здароўя і кліматычныя праблемы, і мы хацелі б пераняць ваш досвед у гэтых галінах», — сказала яна.

# ПАКАЗЧЫК ГАРМАНІЗАЦЫІ ГРАМАДСТВА

Аналітык звярнуў увагу, што задача грамадзян — па максімуме падтрымліваць кіраўніка дзяржавы, урад, каб тыя задачы, арыенціры, якія былі вызначаны ў праграме Аляксандра Лукашэнкі як кандыдата ў Прэзідэнты, на працягу найбліжэйшай пяцігодкі былі рэалізаваны.

### «КАШТОЎНАСЦЬ БУДУЧЫНІ ПЕРАВАЖВАЕ ЎСЕ ХІСТАННІ»



Як падкрэсліў падчас міжнароднага круглага стала «Забеспячэнне электаральнай бяспекі і супрацьдзеянне ўмяшанню ў выбары: вопыт Беларусі» **дырэктар Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў Алег МАКАРАЎ,** мы ўсе — сведкі спакойных выбараў, якія напярэдадні завяршыліся ў Беларусі. «І калі мы выкажам здагадку, што «грамадская дамова» заключаецца ў перыяд выбараў, калі грамадзяне ўсталёўваюць свае адносіны з грамадствам і дзяржавай на найбліжэйшыя пяць гадоў, то з гэтага пункту гледжання «грамадская дамова» ў нашай краіне была заключана раней, пачала рэалізоўвацца раней, а цяпер рухаецца і развіваецца, — лічыць ён. — Грамадзяне галасуюць за тое, што маюць, таму і выбары адбываюцца спакойна».

Па словах Алега Макарава, аналітыкі чакалі большай рэакцыі і актыўнасці ад Захаду на выбары Прэзідэнта Беларусі. «Але яе не было, бо ўстойлівая сістэма нікому не цікавая, — патлумачыў дырэктар БІСД. — Мы ўсе ведаем, што драпежнікі кідаюцца на крывавы след, але калі яго няма, то яны ідуць шукаць іншую ахвяру. У сувязі з гэтым яшчэ адна гіпотэза. Каштоўнасць будучыні, якая прапаноўваецца падчас выбараў, перавешвае тыя хістанні, якія могуць быць у грамадстве ў электаральны перыяд. Пры правільным і дакладным фармуляванні будучыні, якая супадае з запытамі грамадства, гэта стабілізуе выбары».

Алег Макараў звярнуў увагу на тое, што сёння выбары з'яўляюцца не толькі легітымізацыяй курсу канкрэтнага лідара, пераможцы на выбарах, але паралельна вырашаюць шмат задач, у тым ліку задачу ўцягнутасці грамадства ў дзяржаўныя справы. «Наш беларускі вопыт заключаецца ў тым, што мы аддаём перавагу жыць у бесканфліктным асяроддзі, — канкрэтызаваў дырэктар БІСД. — Мы — славянская дзяржава, для якой характэрна таварыства кансэнсусу. У сувязі з гэтым нашы выбары — гэта не бітва канцэптаў. Нашы выбары — гэта спроба гарманізаваць грамадства, сумясціць усе падыходы і ўсе пазіцыі».

### «КРОК ДА ЎМАЦАВАННЯ СУВЕРЭНІТЭТУ»



Па словах **намесніка старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Дзмітрыя БАСКАВА,** выбары паказалі безумоўную падтрымку нашага лідара з боку беларускага народа. «Усе мы на ўласныя вочы бачылі намаганні, якія рабіліся кіраўніком дзяржавы ў папярэднія гады, каб павысіць дабрабыт нашай краіны: ад умацавання суверэнітэту і развіцця сацыяльнай сферы да заваёвання космасу і стварэння магчымасцяў для развіцця любых інавацый, — канстатаваў сенатар. — Разам мы зрабілі свядомы выбар на карысць мірнай і паспяховай будучыні. І гэта агульная для ўсіх беларусаў перамога».



Як падкрэсліў **старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Палаты прадстаўнікоў Ігар МАРЗАЛЮК,** выбары, якія адбыліся, — гэта яшчэ адзін крок да ўмацавання беларускага суверэнітэту, незалежнасці і самадастатковасці нашай дзяржавы. «Беларусь з'яўляецца суб'ектам міжнароднага права, — канстатаваў парламентарый. — Беларуская суб'ектнасць і нацыянальная дзяржаўнасць — геапалітычныя рэаліі. Мы маем свой адметны нацыянальны твар, адметную пазіцыю, і мы ў найлепшых беларускіх нацыянальных традыцыях мэтанакіравана, асэнсавана і ўпарта цярэбім сваю дарогу. Гэта тое, пра што калісьці сказаў Жылка: беларус, калі ўжо ўскараскаўся на гэтую палітычную карту свету, то ён з яе не знікне да другога прышэсця Хрыстовага».

Па словах дэпутата, вырасла некалькі пакаленняў нашых грамадзян, для якіх беларускі суверэнітэт і беларуская незалежнасць як кісларод, як самадастатковае, зразумелае паняцце. «Я абсалютна згодзен з нашым Прэзідэнтам, які сказаў, што гэта пяцігодка будзе пяцігодкай умацавання нашай суверэннай дзяржаўнасці, — зацвярджае парламентарый. — Гэтыя пяць гадоў мы павінны патраціць такім чынам, каб ніхто не мог і сумнявацца ў тым, што мы, як дзяржаўная рэальнасць, знікнем з карты свету».

Стар. 4 ⟶

# ДЭМАКРАТЫЧНА, АДКРЫТА І ТРАНСПАРЭНТНА

## Ігар КАРПЕНКА правёў сустрэчы з міжнароднымі назіральнікамі і паразмаўляў з журналістамі



Фота БелТА.

**Цэнтральную выбарчую камісію наведала прадстаўнічая дэлегацыя міжнародных назіральнікаў з Ірана на чале з паслом гэтай краіны ў Беларусі. Акрамя таго, адбылася сустрэча старшыні Цэнтрвыбаркама з незалежным назіральнікам з Філіпін. У размове з журналістамі Ігар Карпенка звярнуў увагу, што гэтымі днямі прадстаўнікі Цэнтральнай выбарчай камісіі шмат кантактавалі і працягваюць мець зносіны з міжнароднымі назіральнікамі. За прэзідэнцкімі выбарамі ў Беларусі назіралі 486 міжнародных назіральнікаў з 52 краін, у тым ліку 17 заходнееўрапейскіх.**

### «ПРАВОДЗІМ ВЫБАРЫ ДЛЯ СЯБЕ, У ІНТАРЭСАХ САВЁЙ КРАІНЫ, СВАЙГО НАРОДА»

«І ў перыяд назірання за выбарамі, і падчас сустрэч, і цяпер, пасля правядзення выбараў, усе падкрэсліваюць, што працэс быў дэмакратычны, адкрыты, транспарэнтны, — канстатаваў старшыня Цэнтрвыбаркама. — Назіральнікі маглі наведаць любы ўчастак, ніхто іх не абмяжоўваў у кантактах з выбаршчыкамі, што яны і рабілі. Падкрэслівалі, што дастаткова шмат было СМІ, у тым ліку на выбарчых участках, дзе можна было даваць інтэрв'ю, дзяліцца сваімі меркаваннямі адкрыта і свабодна».

Кіраўнік Цэнтрвыбаркама адзначыў, што такі шырокі спектр прадстаўніцтва міжнародных назіральнікаў, уключаючы буйныя місіі ад МПА СНД, ШАС, Панафрыканскага парламента, сведчыць: цікавасць да нашых выбараў была даволі высокая. Беларусь адкрытая і даступная для назірання за ўсім выбарчым працэсам, які арганізаваны ў рамках дзеючага нацыянальнага заканадаўства.

Па словах Ігара Карпенкі, у Цэнтрвыбаркам ніякіх скаргаў пасля выбараў Прэзідэнта Беларусі не паступала. «Мы пачынаем прыёмку пратаколаў з тэрыторый, рыхтуем выніковае пасяджэнне Цэнтральнай выбарчай камісіі, дзе падвядзём канчатковыя вынікі, — удакладніў ён. — З моманту публікацыі пастановы Цэнтральнай выбарчай камісіі яны будуць афіцыйна зацверджаны».

Адказваючы на пытанне журналістаў, як старшыня ЦВК адносіцца да таго, што трапіў пад персанальныя санкцыі Вялікабрытаніі, Ігар Карпенка падкрэсліў, што расцэньвае гэта як найвышэйшую ацэнку дзейнасці Цэнтральнай выбарчай камісіі па правядзенні выбарчага працэсу. Па яго словах, тых, хто ўводзіць гэтыя санкцыі, цікавіць не тое, як арганізаваны працэс і ці адпавядае ён нацыянальнаму заканадаўству. «Іх цікавіць вынік, — адзначыў ён. — Калі вынік будзе той, які ім патрэбен, тады яны будуць ацэньваць яго зусім па-іншаму».

Ігар Карпенка падкрэсліў, што мы праводзім выбары для сябе, у інтарэсах сваёй краіны, свайго народа. «Беларусь выбрала суверэнны шлях развіцця, адбылася як суверэнная дзяржава і мае намер далей развівацца і праводзіць самастойную, незалежную палітыку, — акцэнтаваў ён. — Нягледзячы на тое, што мы невялікая краіна па тэрыторыі, невялікая па колькасці насельніцтва, у нашых людзей таксама ёсць свае інтарэсы. Мы не прэтэндуем на геапалітычныя ініцыятывы. Мы хочам жыць у міры, спакоі і дабрабыце. І не трэба ўмешвацца ў нашы ўнутраныя справы, якімі з'яўляюцца выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь».

Кіраўнік Цэнтральнай выбарчай камісіі падкрэсліў, што ЦВК будзе працягваць палітыку адкрытасці, займацца прававой асветай грамадзян, арганізоўваць сустрэчы ў працоўных калектывах, навучальных установах. Адна з мэт — паказваць перавагі нашай выбарчай сістэмы, яе трываласць і дэмакратычнасць.

### «ПРАВЯДЗЕННЕ СВАБОДНЫХ ВЫБАРАЎ — ПАЦВЯРДЖЭННЕ ТАГО, ШТО КРАІНА ПРАВОДЗІЦЬ НЕЗАЛЕЖНЫ КУРС»

Падчас сустрэч з міжнароднымі назіральнікамі з Ірана і Філіпін Ігар Карпенка выказаў удзячнасць за тое, што яны ўдзельнічалі ў назіранні за выбарамі Прэзідэнта Беларусі.

«Такая прадстаўнічая дэлегацыя з Ірана ўпершыню прымае ўдзел у назіранні за выбарамі, — канстатаваў старшыня Цэнтрвыбаркама падчас сустрэчы з іранскімі парламентарыямі і паслом Ірана ў Беларусі. — У нас адносіны развіваюцца па ўсіх кірунках: і гандлёва-эканамічным, і палітычным, іншых. Цяпер мы адкрываем новую старонку нашага ўзаемадзеяння паміж краінамі ў галіне міжнароднага назірання за выбарамі».

Як паведаміў у размове з прадстаўнікамі СМІ **дэпутат Сходу ісламскага савета (парламента) Ірана Алі КЕШВАРЫ,** галоўным адрозненнем у выбарчых працэсах нашых краін з'яўляецца тое, што ў Беларусі ёсць працэдура датэрмінова галасавання. «У Іране ж усе выбары праводзяцца ў адзін дзень, — удакладніў ён. — Мы звярнулі ўвагу, што на ўсіх участках быў высокі ўзровень парадку і высокая яўка выбаршчыкаў».

Назіранне за прэзідэнцкімі выбарамі ў Беларусі ад Ірана ажыццяўлялі дзве дэлегацыі: ад Сходу ісламскага савета (парламента) і ад Міністэрства ўнутраных спраў. «Тое, што ў Беларусь было запрошана шмат міжнародных назіральнікаў, пацвярджае: выбары былі арганізаваны празрыста, — заўважыў Алі Кешвары. — З пункту гледжання ўсіх міжнародных прынцыпаў усё было зразумела, ясна і празрыста. Правядзенне свабодных выбараў — пацвярджэнне таго, што краіна праводзіць незалежны курс».

Сваімі ўражаннямі ад выбарчага працэсу ў нашай краіне падзялілася і **дырэктар па рэгіянальных выбарах Рэспублікі Філіпіны Марыя Хуна ВАЛЕСА:** «Выбары ў Беларусі даступныя для ўсіх грамадзян і ўяўляюць сабой больш свята, чым пэўную фармальную працэдуру. А высокі працэнт яўкі — паказчык таго, што выбары прайшлі паспяхова. Асабліва нас уразіла працэдура датэрміновага галасавання. У Беларусі яна праходзіць пяць дзён, і ў ёй могуць узяць удзел усе грамадзяне без выключэння. У Філіпінах датэрміновае галасаванне таксама ёсць, але яно доўжыцца адзін дзень, а таму даступна толькі для асобнага класа грамадзян. Спадзяюся, мы зможам пераняць вашу практыку ў нашай краіне».

Практыкай, вартай пераймання, па словах міжнароднага назіральніка, з'яўляецца і даступнасць бюлетэняў для невідушчых людзей. Марыя Хуна Валеса звярнула ўвагу і на адкрытасць выбараў у Беларусі. «Мы наведалі шмат выбарчых участкаў, і на кожным у нас была магчымасць пагутарыць з прадстаўнікамі камісій, нават з выбаршчыкамі, — удакладніла яна. — На ўчастках мы заўважылі шмат прэсы, у нас там нават узялі інтэрв'ю. На Філіпінах гэта лічылася б супрацьзаконным».

**Вераніка КАНЮТА.**

# ВЫБАРЫ Ў БЕЛАРУСІ — ПАКАЗЧЫК ГАРМАНІЗАЦЫІ ГРАМАДСТВА

### «МАЛАДЫЯ ЛЮДЗІ АДЧУЛІ СВАЮ ЗНАЧНАСЦЬ»



Цяперашняя электаральная кампанія прадэманстравала, што выбаршчыкі разумеюць каштоўнасць кожнага голасу. Такой думкай з БелТА падзяліўся **беларускі палітолаг, кіраўнік аналітычнага цэнтра EcooM Сяргей МУСІЕНКА.** «Мы сваёй інфармацыйнай кампаніяй падштурхнулі людзей да разумення таго, што іх выбар мае значэнне, — перакананы ён. — Асабліва гэта датычыцца маладых людзей, якія сапраўды сталі больш актыўныя. Яны ўсвядомілі, што ў 1994 годзе наш Прэзідэнт быў выбраны дзякуючы пазіцыі і адказнасці іх бацькоў за свой выбар. Аляксандр Лукашэнка атрымаў уладу не ад элітнай групоўкі, а ад народа і менавіта праз выбары».

Па словах эксперта, падчас падрыхтоўкі да электаральнай кампаніі 2025 года была праведзена сур'ёзная тлумачальная работа. Адбыўся шэраг мерапрыемстваў, прымеркаваных да 30-годдзя інстытута прэзідэнцтва, друкаваліся кнігі, публікаваліся артыкулы. У прыватнасці, выдавецтвам «Беларусь» пры падтрымцы Міністэрства інфармацыі выпушчана кніга «Сімвалы суверэннай Беларусі» (менавіта яе ўручалі выбаршчыкам, якія галасавалі ўпершыню). Дарэчы, аўтарам і складальнікам кнігі з'яўляецца Сяргей Мусіенка.

Па яго словах, усё гэта ў сукупнасці дало людзям разуменне, што ад іх галасоў залежыць многае. «Маладыя людзі адчулі сваю значнасць, — лічыць Сяргей Мусіенка. — Падчас сёлетняй электаральнай кампаніі, з аднаго боку, яны прадэманстравалі жаданне спакойна жыць і развівацца пад мірным небам, а з другога — гатоўнасць браць адказнасць за сваё рашэнне. Таму актыўнасць маладых людзей, якія ўпершыню галасуюць, была вельмі высокая».

Па меркаванні кіраўніка аналітычнага цэнтра, праводзіць такую шырокамаштабную тлумачальную работу трэба было раней. «Цяперашняя электаральная кампанія адрозніваецца ад папярэдніх, — сказаў Сяргей Мусіенка. — Я ўдзельнічаў у той ці іншай меры ў выбарчых кампаніях з 1989 года. Але гэтыя выбары былі асабліва цікавымі, у тым ліку мерапрыемствамі «Марафону адзінства». У выбаршчыкаў з'явілася цікавасць. Тым самым удалося прыцягнуць тых выбаршчыкаў, якія не адгукаліся ні на тэлебачанне, ні на прэсу».

### «НАРОД САМ РОБІЦЬ СВОЙ ВЫБАР. І НЯВАЖНА, ЯКІЯ ЁСЦЬ РЭЗАЛЮЦЫІ»

Высокую арганізацыю прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі, іх адкрытасць і дэмакратычнасць адзначаюць і еўрапейскія эксперты, якія назіралі за працэсам унутры нашай краіны. Як падкрэсліў **эксперт з Германіі Фарыд ЗАКІРАЎ,** ён не бачыць ніякіх асабліврасцяў у выбарчай кампаніі ў Беларусі.



«Грамадзяне, якія валодаюць выбарчым правам, маглі азнаёміцца з праграмамі ўсіх кандыдатаў, яны былі даступныя, — удакладніў міжнародны эксперт. — Я нават сам будучы ў Германіі паглядзеў іх. Таксама ў нас была дадзена магчымасць пагутарыць з кандыдатамі ў Прэзідэнты, а таксама іх даверанымі асобамі».

Фарыд Закіраў звярнуў увагу на спакойную абстаноўку на беларускіх вуліцах. «Народ сам рабіў свой выбар, — падкрэсліў ён. — І няважна, якія ёсць рэзалюцыі. Гэта як у футболе, калі перад трэніроўкай трэнер кажа: «Нам няважна, як будуць гуляць іншыя, мы павінны гуляць сваю гульню»».

Кажучы аб непрызнанні некаторымі краінамі легітымнасці папярэдніх выбараў у Беларусі, эксперт з Германіі падкрэсліў, што легітымнасць — гэта пытанне, якое вырашаецца выключна ўнутры краіны. «Я працаваў у вашай краіне, знаёмы з менталітэтам беларусаў, прыкладна разумею, як жыве соцыум, а таму магу рабіць высновы, — заўважыў ён. — Але калі нехта пачынае казаць дрэннае пра краіну, у якой ні разу не быў, гэта па меншай меры наваат нявеетліва. Раскажаць казкі можна заўсёды. А я вам раскажу іншае: у сталовай футбольнага клуба «Дынама-Брэст» абед каштаваў тры-чатыры рублі, а гэта адзін еўра. Пакажыце мне, дзе ў Германіі, акрамя студэнцкай сталовай у Брэмене, абед будзе каштаваць столькі ж?»

**Вераніка КАНЮТА.**

### Тым часам

У Міністэрстве замежных спраў пракаментавалі сумесную заяву ЕС і краін, якія далучыліся, у адрас Беларусі. Адзначаецца, што такая пазіцыя, як сведчыць аб'ектыўны вопыт апошніх дзесяцігоддзяў, не прывядзе ні да чаго, акрамя далейшага пагаршэння адносін з Беларуссю. «У сваю чаргу іх нармалізацыя магла б быць выгадная перш за ўсё ініцыятарам заявы для вырашэння агульных для ўсіх праблем у еўрапейскім рэгіёне і свеце, — падкрэслілі ў знешнепалітычным ведамстве. — Відавочная розніца паміж ацэнкамі назіральнікаў, якія наведалі Беларусь, з больш як 50 краін, уключаючы заходнія, і загадзя нарыхтаванымі штампамі ЕС. Беларусы, зрабіўшы свой выбар, выказаліся за прадаўжэнне лініі на пабудову моцнай і квітнеючай дзяржавы, фарміраванне ўласнай, адпаведнай нашай гісторыі, традыцыям і менталітэту мадэлі сучаснай дэмакратычнай грамадзянскай супольнасці».

# ЭКАНАМІЧНЫ РОСТ АДЧУЕМ ПА ЎЛАСНАЙ КІШЭНІ

**Міністр працы і сацыяльнай абароны Наталля ПАЎЛЮЧЭНКА расказала «Звяздзе» пра павелічэнне зарплат, пенсій і дапамог, а таксама пра іншыя змяненні**



***— Наталля Віктараўна, якія новаўвядзенні ў сферы сацыяльнай абароны нас чакаюць?***

— Новаўвядзенняў шмат, і яны закранаюць беларусаў усіх узростаў: ад дзяцей да людзей у гадах. Звязана гэта з тым, што сёлета ўступае ў дзеянне шэраг важных дакументаў. Гэта і законы аб занятасці насельніцтва, па пытаннях ветэранаў, дзяржаўных дапамог сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей, Указ «Аб сацыяльнай падтрымцы», які здымае абмежаванні па памеры працоўнай пенсіі. Да таго ж пачатак года парадуе ростам заробкаў бюджэтнікаў, пенсій, мінімалкай, якая павялічылася, і новым памерам сямейнага капіталу.

***— Давайце прывядзём топ-3 змяненняў.***

## — Першае.

**Са студзеня павялічваецца зарплата ў бюджэтных арганізацыях. Рост заробкаў будзе забяспечаны павышэннем базавай стаўкі, якая з 1 студзеня склала 270 рублёў.**

У параўнанні з 1 верасня 2024 года (тады яна складала 253 рублі) базавая стаўка павялічваецца на 6,7 %, а калі параўноўваць з 1 студзеня 2024 года (250 рублёў), то на 8 %. Паколькі да базавай стаўкі прывязаны іншыя стымулявальныя і кампенсавальныя выплаты, то іх памеры з 1 студзеня таксама павялічыліся. Адзначу, што, як і ў 2024 годзе, базавая стаўка ў 2025 годзе будзе расці ў некалькі этапаў.

***— Колькі людзей закране гэта мера?***

— У краіне больш за 860 тысяч бюджэтнікаў. Летась на аплату іх працы з бюджэту накіравана звыш 17 мільярдаў рублёў. Сярэднямесячная заработная плата бюджэтнікаў у цэлым за мінулы год вырасла на 17,4 % і склала больш чым 1,7 тысячы рублёў, у снежні — амаль дзве тысячы рублёў (рост на 14,2 %). За год рост рэальнай заработнай платы склаў 111,1 %. Дарэчы, ён апярэджвае рост узроўню цэн на спажывецкім рынку.

Вяртаючыся да сёлетніх змяненняў, дадам, што з 1 студзеня дадаткова павялічыліся памеры галіновых стымулявальных выплат педагагічным і медыцынскім работнікам, работнікам сфер культуры, сацабслугоўвання, фізічнай культуры і спорту. На гэтыя мэты ў бюджэце прадугледжаны сродкі ў памеры аднаго мільярда рублёў.

Летась асаблівая ўвага была ўдзелена педагагічным работнікам і настаўнікам. Іх заработная плата расла апераджальнымі тэмпамі: у настаўнікаў яна павялічылася на амаль 26 % і склала больш за дзве тысячы рублёў. Былі павялічаны памеры стымулявальных выплат і іншым катэгорыям работнікаў аховы здароўя, культуры, сферы сацыяльнага абслугоўвання, фізічнай культуры і спорту.

Як вынік, сярэдні заробак склаў ва ўрачоў 3,2 тысячы рублёў (рост на 12,2 %), сярэдняга медыцынскага персаналу — 1,8 тысячы рублёў (рост на 13,1 %), сферы сацыяльнага абслугоўвання — 1,3 тысячы рублёў (рост на 15,9 %).

З 1 студзеня ў бюджэтнікаў з'явілася яшчэ адна рэальная магчымасць істотнага павелічэння заработнай платы. Згодна з Указам Прэзідэнта № 429, кіраўнікам бюджэтных арганізацый прадастаўлена права зацвярджаць штатную колькасць работнікаў у меншым складзе, чым прадугледжана нарматыўнымі дакументамі. Пры гэтым фонд заработнай платы застаецца ранейшым, ён будзе разлічаны на колькасць, якая адпавядае нарматывам.

Даплату ў памеры да 100 % заработнай платы (за выключэннем надбаўкі за работу па кантракце) можа атрымаць рабочы, які выконвае дадатковыя працоўныя абавязкі. Такім чынам, у залежнасці ад аб'ёму выкананай работы зарплата можа павялічыцца ў два разы. У цэлым сёлета стаіць задача дасягнуць росту зарплат бюджэтнікаў да ўзроўню мінулага года на 15 %.

## Другое.

Сёлета мы адзначаем 80-годдзе Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Задача нашага міністэрства — акружыць клопатам і ўвагай ветэранаў вайны, вырашыць іх сацыяльна-бытавыя пытанні. Сацыяльная падтрымка ветэранаў — гэта дзяржаўны прыярытэт. Мы ўжо зрабілі комплексную карэкціроўку заканадаўства па пытаннях ветэранаў з улікам практыкі прымянення. Так, актуалізаваныя катэгорыі ветэранаў, а таксама пералік ільгот, прывілей і гарантый, якія прадастаўляюцца ім і асобам, якія пацярпелі ад наступстваў вайнаў, у тым ліку ў рамках гарманізацыі заканадаўства Беларусі і Расіі.

**Улічваючы, што нашых ветэранаў, на жаль, засталося няшмат, з году ў год працягваюць павялічвацца памеры выплат да Дня Перамогі.**

Летась яны склалі ад 1 да 4 тысяч рублёў. Сёлета на гэтыя мэты запланавана выдаткаваць каля 9,2 мільёна рублёў.

## Трэцяе.

**Зняты абмежаванні памеру пенсій пенсіянерам, якія працуюць.**

У нашай краіне іх каля 446 тысяч, і ў 110 тысяч з іх дзейнічалі такія абмежаванні. Яны, працягваючы працаваць або пры выхадзе на работу, страчвалі частку сваіх пенсій. Гэтая частка ва ўсіх розная — ад невялікай сумы да амаль 500 рублёў, калі памер пенсіі вялікі і індывідуальны каэфіцыент сфарміраваўся дастаткова высокім.

Да таго ж з 2025 года спрошчана працэдура збору дакументаў для назначэння пенсіі. Вылічэнне яе памеру плануецца ажыццяўляць зыходзячы з заробку за апошнія 30 гадоў працоўнай дзейнасці. Гэта дазволіць штогод зніжаць часовыя затраты па зборы даведак аб заробку на папяровым носьбіце. Апроч таго, грамадзянам цяпер даецца права звяртацца па назначэнне пенсіі за месяц *да* або *пасля* ўзнікнення права на яе, што будзе, бясспрэчна, зручным варыянтам. Пры гэтым назначэнне стане ажыццяўляцца з дня ўзнікнення права на пенсію.

***— Якія ініцыятывы будуць накіраваны на падтрымку сем'яў з дзецьмі?***

— Сёлета мы будзем рэалізоўваць новыя нормы заканадаўства, якія ўступілі ў сілу з 1 студзеня і накіраваны на стварэнне спрыяльных умоў для сем'яў і нараджэння дзяцей у сем'ях. Так, у сістэме дзяржаўных дапамог узмоцнена падтрымка маладых жанчын, якія чакаюць нараджэння дзіцяці. Істотна павялічыўся мінімальны памер дапамогі па цяжарнасці і родах: утрая — для застрахаваных жанчын, якія не маюць шасці месяцаў стажу работы (з 50 % бюджэту пражытачнага мінімуму (БПМ) да 100 % мінімальнай заработнай платы); удвая — для будучых мам, якія атрымліваюць адукацыю і яшчэ не выйшлі на рынак працы, а таксама для тых, хто праходзіць службу або зарэгістраваны ў якасці беспрацоўных, — з 50 % да 100 % БПМ.

Павышаны ўзровень сацыяльнай падтрымкі сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей з інваліднасцю, а таксама сем'яў з непаўналетнімі дзецьмі, у якіх дзіця-інвалід ужо дасягнула ўзросту 18 гадоў. З 1 студзеня непрацуючыя бацькі, якія ажыццяўляюць догляд дзіцяці-інваліда, могуць па накіраванні службы занятасці праходзіць навучанне ці перанавучанне па прафесіях, запатрабаваных на рынку працы, з захаваннем за гэты перыяд спецыяльнай дапамогі па доглядзе.

Для захавання ўзроўню матэрыяльнай падтрымкі сем'яў з непаўналетнімі дзецьмі, у якіх дзіця-інвалід ужо дасягнула ўзросту 18 гадоў, прадастаўлена права на назначэнне дапамогі дзецям, старэйшым за тры гады. Мы забяспечылі пераемнасць у выплаце дапамог па доглядзе дзіцяці-інваліда пасля дасягнення ім узросту 18 гадоў за бацькамі, якія працуюць у рэжыме няпоўнай занятасці, захоўваецца права на атрыманне дапамогі па доглядзе свайго паўналетняга дзіцяці-інваліда, якому ўстаноўлена I група інваліднасці.




Адна з самых значных мер падтрымкі беларускіх сем'яў — гэта праграма сямейнага капіталу, якая рэалізуецца з 2015 года пры нараджэнні трэцяга або наступнага дзіцяці. Указам кіраўніка дзяржавы дзеянне праграмы прадоўжана да 31 снежня 2029 года. Адначасова з улікам запытаў грамадства прадугледжаны і іншыя меры. У іх ліку — магчымасць выкарыстання сямейнага капіталу сем'ям, якія пабудавалі жыллё самастойна, без накіравання мясцовых органаў улады. Пашыраны пералік тавараў, якія можна будзе набыць для членаў сям'і з інваліднасцю з парушэннем зроку, — ён дапоўнены асістыўнымі прыладамі для арыентацыі і для прагляду. Гэта дарагія тавары, іх набыццё ў значнай ступені аблегчыць магчымасць арыентавання ў навакольным асяроддзі, персанальнай мабільнасці і камунікацыі.

**Алена КРАВЕЦ.**

## Задача ад Першага

*«Распрацуйце нейкую вёску, зробім яе "разумнай". Там крыху людзі іншыя, але, тым не менш, гэта можна. Калі ў вас ёсць такая ідэя і пад яе ёсць людзі, давайце зробім.»*

*Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы са студэнтамі інжынерна-тэхнічных ВНУ Мінска ў фармаце «Адкрыты мікрафон». 27 верасня 2024 года.*

# Вёску будучыні ствараем ужо сёння

**Прарэктар па навуковай рабоце БДУ, прафесар, доктар хімічных навук Андрэй БЛАХІН.**

— Беларускі аграпрамысловы комплекс сёння інтэнсіўна развіваецца. Інавацыйныя распрацоўкі ўкараняюцца ва ўсе яго сферы: раслінаводства, жывёлагадоўлю, ветэрынарыю. Важнасць укаранення інавацый звязана не толькі з жаданнем кіраўнікоў прадпрыемстваў АПК дасягнуць максімальных якасных і колькасных паказчыкаў, але і з іх імкненнем давесці да розуму і сельскагаспадарчую вытворчасць, і саму вёску.

Інавацыйныя распрацоўкі вучоных Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта шырока прымяняюцца ў сельскай гаспадарцы. Развіццё жывёлагадоўлі ў значнай ступені залежыць ад забеспячэння неабходнага ўзроўню ветэрынарнай бяспекі. Інавацыйныя ветэрынарныя прэпараты для лячэння і прафілактыкі хвароб сельскагаспадарчых і хатніх жывёл распрацаваны нашай кафедрай мікрабіялогіі біялагічнага факультэта, іх вытворца — рэзідэнт тэхнапарка БДУ — ТАА «НПЦ ПраБіяТэх». Прэпараты прызначаны для лячэння і прафілактыкі захворванняў інфекцыйнай і неінфекцыйнай прыроды і не маюць сусветных аналагаў. Асноўная ідэя распрацоўкі заключаецца ва ўжыванні ўласных ахоўных бялкоў (інтэрферонаў) жывёл, атрыманых рэкамбінантным спосабам (выпрацоўваюцца генна-мадыфікаванымі бактэрыямі), для лячэння і прафілактыкі захворванняў сельскагаспадарчых і непрадуктыўных жывёл. Прэпараты шматфункцыянальныя і валодаюць адначасова імунамадуляцыйнай, супрацьвіруснай і антыбактэрыяльнай актыўнасцю, відаспецыфічныя і дазваляюць выключыць або знізіць прымяненне антыбіётыкаў у жывёлагадоўлі.

Прымяненне інавацыйных прэпаратаў дазваляе ў два-тры разы скараціць тэрміны лячэння жывёл, вылечваць мастыты буйной рагатай жывёлы без выкарыстання антыбіётыкаў, павысіць паказчыкі захаванасці і ўзнаўлення жывёл у два — два з паловай раза. Усе прэпараты адносяцца да VI тэхналагічнага ўкладу па прыкмеце «Генна-інжынерныя тэхналогіі», больш за 20 прэпаратаў і 30 субстанцый атрымалі дзяржаўную рэгістрацыю. І іх лінейка пастаянна абнаўляецца.

Сучасная навука шукае адказы на агульнасусветныя выклікі біялагічнай бяспекі раслін і павышэння ўраджайнасці без шкоды для экасістэмы. Менавіта такімі з'яўляюцца біяпрэпараты для аховы і стымуляцыі росту раслін, распрацаваныя кафедрай генетыкі біялагічнага факультэта. Па ліцэнзійных дагаворах з БДУ прэпараты выпрацоўваюць ААТ «Бабруйскі завод біятэхналогій», ТАА «Цэнтр інавацыйных тэхналогій» у Віцебскай і ТАА «Сферум» у Мінскай абласцях. Усе біяпрэпараты — «Немацыд КС», «Максімун», «Стымул», «Караняплюс», «Бактаген», «Гулівер», «Жыцень» — экалагічна бяспечныя. Яны ўжо паспяхова прымяняюцца ў сельскай гаспадарцы і садаводстве Беларусі і, паводле ацэнак спецыялістаў, дазваляюць значна павялічыць ураджайнасць культур.

Для барацьбы са шкоднікамі садоў і лясоў кафедрай арганічнай хіміі хімічнага факультэта распрацаваны сінтэтычныя фераманы насякомых і наладжана вытворчасць ферамонных прэпаратаў, якія выкарыстоўваюцца ў лясной, паркавай і сельскай гаспадарках супраць 19 відаў шкоднікаў. Усе прэпараты вырабляюцца з ужываннем рэчываў, ідэнтычных прыродным, якія прадуцыруюцца асобінамі гэтага віду, населенымі ў Беларусі. Ёсць сертыфікаты для прымянення прэпаратаў на тэрыторыі ЕАЭС. Адна з апошніх распрацовак — ферамонны прэпарат «Дзівабіт» для выяўлення каранціннага віду — каларадскага кукурузнага жука.

# ТРЭНД НА ПАЗІТЫЎ

**Аналітыкі ЕАБР чакаюць захавання станоўчай дынамікі эканамічнай актыўнасці ў 2025-м**

Гэта вынікае са штотыднёвага агляду Еўразійскага банка развіцця, у якім яны канстатуюць, што ВУП у Беларусі ў 2024 годзе павялічыўся на 4 % у гадавым выражэнні. Ключавы драйвер эканомікі — прамысловасць, рост выпуску ў якой (+5,4 % год ад года) забяспечыў каля 1,4 працэнтнага пункта прыросту ВУП за 2024 год.

— Значную ролю ў пашырэнні эканамічнай актыўнасці сыграў гандаль, сфарміраваўшы каля 0,5 працэнтнага пункта прыросту ВУП на фоне росту рознічнага гандлю (+11,8 %) і аптовага таваразвароту (+2,6 %). У сельскай гаспадарцы тэмпы росту склаліся на ўзроўні 3,4 % у 2024-м, забяспечыўшы каля 0,2 працэнтнага пункта прыросту ВУП, — адзначаецца ў аглядзе.

Адзначаецца яшчэ адзін пазітыўны трэнд: інвестыцыі ў асноўны капітал летась павялічыліся на 8 %.

— Чакаем захавання станоўчай дынамікі эканамічнай актыўнасці ў 2025 годзе, — падкрэсліваюць аналітыкі ЕАБР.

Дарэчы, аналізуючы сітуацыю ў нашай краіне ў макраэканамічным прагнозе на 2025—2027 гады, спецыялісты звярталі ўвагу на такі фактар, як пашырэнне ўнутранага попыту і рост экспартных паставак у Расію, якія паўплывалі на павелічэнне выпуску.

— Значны ўплыў на эканамічную актыўнасць аказалі пашырэнне крэдытавання і дзеянні ўлад па стымуляванні інвестыцый. Ацэнка росту на бягучы год павышана на 0,9 працэнтнага пункта ў параўнанні з папярэднім прагнозам (ЕАБР), а асноўнай прычынай перагляду стала захаванне моцнага попыту з боку асноўнага гандлёвага партнёра — Расіі. У галіновым разрэзе адзначаецца павелічэнне выпуску ва ўсіх ключавых сектарах, аднак аснову эканамічнага росту па-ранейшаму забяспечвае прамысловая вытворчасць, — канстатуюць спецыялісты.

# ДАПАМОГА ТЫМ, ХТО МАЕ Ў ЁЙ ПАТРЭБУ

**Летась адрасную сацыяльную дапамогу атрымалі больш за 255,6 тысячы чалавек**



Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе Мінпрацы, патлумачыўшы, што такая дапамога ўключае чатыры сацвыплаты.

Першая — штомесячная сацыяльная дапамога для сем'яў.

Яна даецца пры ўмове, калі сярэднедушавы даход па аб'ектыўных прычынах ніжэй за крытэрый патрэбы — 447,64 рубля (з 1 лютага).

Шматдзетным сем'ям такая дапамога прызначаецца, калі сярэднедушавы даход не большы за 1,15 велічыні крытэрыя патрэбы — 514,79 рубля (таксама з 1 лютага).

Другая — аднаразовая сацыяльная дапамога.

Яна выплачваецца, калі чалавек апынуўся ў цяжкай жыццёвай сітуацыі, пры ўмове, што сярэднедушавы даход не большы за 1,5 велічыні крытэрыя патрэбнасці — 671,46 рубля (з 1 лютага).

Трэцяя — сацыяльная дапамога для кампенсацыі выдаткаў на набыццё прадметаў гігіены.

Яна выдзяляецца незалежна ад велічыні даходу сям'і дзецям-інвалідам, якія маюць IV ступень страты здароўя, і інвалідам I групы. Робіцца гэта на падставе індывідуальнай праграмы рэабілітацыі або заключэнні ўрачэбна-кансультацыйнай камісіі аб патрэбнасці ў прадметах гігіены пры наяўнасці дакументаў, якія пацвярджаюць выдаткі на іх набыццё.

І, нарэшце, чацвёртая — датычыцца забеспячэння прадуктамі харчавання дзяцей першых двух гадоў жыцця.

Гэта выплата прадугледжана для сем'яў, дзе даход ніжэйшы за крытэрый патрэбы, а таксама пры нараджэнні двайнят і больш дзяцей — незалежна ад узроўню даходу.

У ведамстве таксама расказалі пра сярэднія памеры адрасных сацыяльных дапамог за 2024 год: памер штомесячнай сацыяльнай дапамогі склаў 145,57 рубля, аднаразовай дапамогі — 237 рублёў, дапамогі на набыццё прадметаў гігіены — 572,4 рубля і забеспячэнне харчаваннем дзяцей да 2 гадоў — 218,8 рубля.

# ПЛЮС У КАШАЛЬКУ

**Белстат: намінальная налічаная сярэдняя заработная плата работнікаў краіны павялічылася**

Паводле даных статыстыкі, у снежні 2024-га намінальная налічаная сярэдняя заработная плата работнікаў склала 2 693,9 рубля.

Самы высокі сярэдні налічаны заробак быў у Мінску — 3792,5, з рэгіёнаў у лідарах — Мінская вобласць — 2703,2, далей ішлі Брэсцкая (2436,9), Гомельская (2345,0), Гродзенская (2326,4), Віцебская (2187,1) і Магілёўская (2132,6) вобласці.

Дарэчы, Нацбанк днямі ў аналітычным аглядзе «Асноўныя тэндэнцыі ў эканоміцы і грашова-крэдытнай сферы Рэспублікі Беларусь» за студзень — лістапад 2024 года адзначаў, што намінальная налічаная сярэднямесячная заработная плата работнікаў арганізацый нашай краіны (без мікраарганізацый і малых арганізацый без ведамаснай падпарадкаванасці) у лістападзе 2024-га складала 2 331,8 рубля, што ў рэальным выражэнні на 11,7 % было вышэй за ўзровень лістапада 2023 года.

Трэба сказаць, што ў разрэзе ўзбуйненых відаў дзейнасці найбольшы ўзровень сярэднямесячнай налічанай заработнай платы ў снежні мінулага года зафіксаваны ў сферы інфармацыі і сувязі, а найменшы — у арганізацыях галіны адукацыі.

# ВЫРАШЫЦЬ ЖЫЛЛЁВАЕ ПЫТАННЕ

**Колькі новых «квадратаў» з'явілася летась у краіне, расказалі ў Белстаце**

У ведамстве адзначылі, што ў 2024 годзе арганізацыямі ўсіх формаў уласнасці пабудавана 47,3 тысячы новых кватэр. Уведзена ў эксплуатацыю 4 390,5 тысячы квадратных метраў агульнай плошчы жылля.

Тут дадалі, што для грамадзян, якія стаяць на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, уведзена ў эксплуатацыю 1,4 мільёна квадратных метраў агульнай плошчы, або 32,5 % ад агульнага аб'ёму ўведзенага жылля.

— З агульнага аб'ёму ўведзенага жылля для грамадзян, якія стаяць на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў з выкарыстаннем дзяржаўнай падтрымкі, пабудавана 832,1 тысячы квадратных метраў. Для шматдзетных сем'яў уведзена 508,8 тысячы квадратных метраў агульнай плошчы жылля, — патлумачылі ў Нацыянальным статыстычным камітэце.

Што да вырашэння жыллёвага пытання вяскоўцаў, то ў сельскіх населеных пунктах уведзена ў эксплуатацыю 1,5 мільёна квадратных метраў агульнай плошчы жылля, або 35,9 % ад агульнага ўводу па краіне.

# ТЭНДЭНЦЫЯ РОСТУ

**Кіраўнікі прампрадпрыемстваў чакаюць павелічэння попыту і аб'ёмаў выпуску прадукцыі**

Пра гэта сведчаць вынікі кан'юнктурнага апытання, якое правёў НДЭІ Мінэканомікі ў студзені бягучага года. Паводле яго, дзве трэці рэспандэнтаў адзначаюць захаванне альбо рост попыту на сваю прадукцыю. Сярэдні перыяд забяспечанасці прадпрыемстваў заказамі (3,2 месяца) і ўзровень загрузкі вытворчых магутнасцяў (70 %) не змяніліся.

— Большасць апытаных (88 %) канстатавалі захаванне альбо павелічэнне колькасці работнікаў. Кіраўнікі нацэлены на далейшае развіццё прадпрыемстваў: сярод кірункаў выкарыстання інвестыцый лідзіруюць абнаўленне (78 %) і пашырэнне (36 %) вытворчых магутнасцяў, — адзначылі ў ведамстве.

Таксама тут звярнулі ўвагу на той факт, што ў кароткатэрміновым перыядзе ўдзельнікі апытання чакаюць павелічэння попыту і аб'ёмаў выпуску, а таксама росту колькасці працоўных.

Мясцовае Самакіраванне
Газета для выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых Саветаў
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
29 студзеня 2025 г. № 3 (784)

# «ГЭТА КРОК У ПРАВІЛЬНЫМ КІРУНКУ»

**Указ Прэзідэнта «Аб асаблівасцях прадастаўлення і выкарыстання арэнднага жылля», падпісаны кіраўніком дзяржавы літаральна назаўтра пасля выбараў, выклікаў асаблівы рэзананс у рэгіёнах. Дакумент, які дае паўнамоцтвы мясцовым органам улады прымаць рашэнні аб выдзяленні арэнднага жылля асабліва запатрабаваным спецыялістам, з першага дня, як кажуць, пайшоў у народ. Нашы карэспандэнты на месцах пацікавіліся, які эфект чакаюць ад яго рэалізацыі.**

— Магу сказаць, што гэты ўказ асабліва чакалі ў сельскай мясцовасці, — гаворыць **Аксана ВЫСАГРОЦКАЯ, старшыня Камянецкага раённага Савета Брэсцкай вобласці.** — Фактычна штодня сустракаемся са старшынямі сельскіх Саветаў і абмяркоўваем кадравую праблему. Сёння гаворка ідзе аб наяўнасці ўсёй патрэбнай інфраструктуры як гарантыі якасці жыцця вясковага чалавека. А пра якую якасць можна гаварыць, калі вясковы ФАП ці нават амбулаторыя не ўкамплектаваныя медыцынскімі работнікамі? Вядома, пытанне будзе неяк вырашацца, спецыялісты прыедуць па графіку з іншых устаноў і правядуць прыём. Але ж, пагадзіцеся, сумяшчальнік — не пастаянны работнік. Тое ж самае датычыцца настаўнікаў, спецыялістаў іншых катэгорый.

**А новы ўказ дае магчымасць забяспечыць чалавека жыллём, больш за тое, зробіць аплату гэтага жылля больш даступнай. Апошняе можа прывабіць маладыя сем'і спецыялістаў.**

Нямала маладых людзей бяруць шлюб на апошніх курсах ВНУ, яны разглядаюць магчымасці працаўладкавання там, дзе ёсць жыллё, каб сям'я не проста камфортна пражывала, але і прырастала. Кажу пра кадры для сацыяльнай сферы, але мы на ўвазе таксама спецыялістаў сельскагаспадарчага профілю. На работу прыходзяць аграномы, інжынеры, працаўнікі рабочых спецыяльнасцяў. Ім таксама трэба жыллё, тады многія з іх створаць сем'і і не будуць шукаць магчымасці з'ехаць адразу пасля адпрацоўкі.

Зрэшты, арэнднае жыллё для спецыялістаў сельскай гаспадаркі можна будаваць і ў райцэнтры, лічыць **старшыня Лоеўскага раённага Савета Гомельскай вобласці Ірына ПАСТУХОВА.**

**— Для работнікаў сельгаспрадпрыемстваў — тых жа бухгалтараў, інжынерна-тэхнічных спецыялістаў — арэнднае жыллё ў райцэнтры было б вельмі прывабным момантам для далейшага замацавання ў гаспадарках. Бо заўжды арганізоўваюць падвоз работнікаў, і многія з радасцю жылі б у Лоеве, а працавалі ў сельскай мясцовасці, — гаворыць яна.**



Фота БелТА.

Дарэчы, у Лоеве з забяспечанасцю арэндным жыллём справы нядрэнныя: у мінулым годзе тут узвялі першы ў раёне 40-кватэрны жылы электрадом. Арэнднае жыллё ў ім атрымалі ў тым ліку маладыя спецыялісты, якія прыехалі ў райцэнтр па размеркаванні, расказвае Ірына Пастухова. І будаўніцтва арэнднага жылля ў горадзе працягваецца, прычым у гарпасёлку ўжо ёсць «дом медыкаў», арэндным жыллём увогуле тут забяспечаны ўсе маладыя спецыялісты аховы здароўя. Таму не выглядае выпадковасцю, што ў апошнія гады паказчык замацавання маладых спецыялістаў у нас палепшыўся. Прычым, азначае кіраўнік райсавета, не толькі мясцовая моладзь пасля вучобы вяртаецца на радзіму, але і ўраджэнцы іншых раёнаў, абласцей для працы і жыцця выбіраюць Лоеў.

— У нашым раёне, лічу, важна падтрымаць арэндным жыллём у тым ліку спецыялістаў сацыяльнай сферы і сферы культуры, — звяртае ўвагу дэпутат.

А вось у Свіслачы, што на Гродзеншчыне, арэндных дамоў пакуль няма: хутка з'явіцца першы. Як паведаміў **намеснік старшыні Свіслацкага райвыканкама Юрый КУЛЯШОЎ,** для гэтай мэты рыхтуецца праект па рэканструкцыі былога інтэрната на 36 двух- і аднапакаёвых кватэр.

— З выхадам указа справа з дакументацыяй павінна пайсці хутчэй. Мы спадзяёмся на ўключэнне ў абласную інвестпраграму», — зазначыў суразмоўца.

**Штогод у Свіслацкі раён прыходзіць на працу амаль паўсотні маладых спецыялістаў. Сферы самыя розныя: гэта і аграпрамысловы комплекс, і адукацыя, і культура, і медыцына, і органы ўнутраных спраў. І амаль усе спецыялісты маюць патрэбу ў жыллі.**

Арэнднае жыллё, на думку Юрыя Куляшова, дазволіць палепшыць замацаванне маладых спецыялістаў у раёне. Цяпер гэты паказчык складае 60 %. Але тут імкнуцца да таго, каб ён дасягаў 80—85%.

У аграгарадку Ноўка Віцебскага раёна сёлета будзе ўведзены ў эксплуатацыю новы пяціпавярховы дом. У ім будзе два пад'езды і 40 кватэр: аднапакаёвыя, двух- і трохпакаёвыя. Частку з іх плануецца выкарыстоўваць у якасці арэндных. У такога жылля ёсць свае плюсы: напрыклад, аплата арэнды для маладых спецыялістаў ажыццяўляецца па зніжаным каэфіцыенце. Для сваіх працаўнікоў у аграгарадку Кіраўская будуе пяціпавярховік Віцебская бройлерная птушкафабрыка. Здаць аб'ект запланавана ў бягучым годзе, кватэры ў новым доме атрымаюць работнікі агракомплексу «Адраджэнне».

— Тое, што Прэзідэнт пасля выбараў першым падпісаў менавіта гэты ўказ, гаворыць аб тым, што кіраўнік дзяржавы клапоціцца аб кожным грамадзяніне Беларусі», — адзначае **старшыня Ноўкінскага сельскага Савета Дзяніс ЖАВАРАНКАЎ.**

У Слаўгарадскім раёне Магілёўшчыны таксама разлічваюць на тое, што ўказ дапаможа замацаваць патрэбныя кадры, у прыватнасці будаўнікоў.

— Нам у раёне сёння вельмі патрэбныя будаўнікі і дарожнікі, незалежна ад таго, майстар гэта або тынкоўшчык, — гаворыць **старшыня Слаўгарадскага райсавета Святлана ЯЗЕРСКАЯ.** — Раён развіваецца, тым больш наступная пяцігодка накіраваная на развіццё рэгіёнаў, і патрэба ў работніках будаўнічых спецыяльнасцяў вельмі вялікая. Мы ўвесь час думалі, як іх замацаваць. Інтэрнат не прываблівае. Новы ўказ даў раённым і гарадскім выканкамам магчымасць самастойна вызначыць пералік спецыялістаў, якім можна даць арэнднае жыллё. І гэта цудоўна. Вялікі дзякуй Прэзідэнту за тое, што ён нас падтрымаў. Тэма неаднаразова абмяркоўвалася, і нарэшце з'явіўся рэальны механізм. Мы вельмі рады гэтаму ўказу. Не так даўно да нас прыязджалі студэнты з каледжа — тынкоўшчыкі, маляры, іншыя будаўнічыя спецыялісты. Спадзяёмся, што іх прывабіць магчымасць атрымаць жыллё. Ёсць ужо на прыкмеце і працоўныя кадры, якім хацелася б дапамагчы з кватэрамі.

Здавалася, у мегаполісе праблема арэнднага жылля не такая актуальная. Але Міхаіл Мірончык, дэпутат Палаты прадстаўнікоў ад Каменнагорскай акругі № 102 г. Мінска, ведае, што ўказ чакалі і ў сталіцы.

— Для жыхароў Фрунзенскага раёна тэма арэнднага жылля заўсёды была і будзе актуальнай, — гаворыць ён. — Раён у нас густанаселены, тут вельмі шмат школ, і даступнае жыллё для педагогаў — добрая дапамога! Таксама гэты ўказ дазволіць вырашыць праблему замацавання маладых кадраў пасля адпрацоўкі па размеркаванні. Новы ўказ, несумненна, з'яўляецца крокам у правільным кірунку!

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА,**
**Нэлі ЗІГУЛЯ,**
**Наталля КАПРЫЛЕНКА,**
**Маргарыта УШКЕВІЧ,**
**Даніїл ХМЯЛЬНІЦКІ,**
**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



## Міжнародныя стасункі, клопат аб людзях і сувязь з народам

### Чым быў адметны працоўны тыдзень сенатараў

● Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей Алейнік правёў сустрэчу з членам Сената (верхняй палаты) Парламента Keніі Ледамам Алекіна. У ходзе размовы быў адзначаны высокі ўзровень супрацоўніцтва Беларусі і Кеніі, які дасягнуты ў першую чаргу дзякуючы кантактам і дамоўленасцям на вышэйшым узроўні. Сяргей Алейнік выказаў зацікаўленасць беларускага боку ў развіцці двухбаковага супрацоўніцтва з Кеніяй у сферах сельскай гаспадаркі, аховы здароўя і адукацыі з улікам высокага ўзроўню развіцця гэтых галін у Беларусі. Акрамя таго, ён звярнуў увагу на неабходнасць устанаўлення міжрэгіянальных сувязяў, што паслужыць дадатковым стымулам для развіцця адносін у сацыяльна-эканамічнай, гуманітарнай і культурнай сферах. Са свайго боку кенійскі сенатар пацвердзіў гатоўнасць актыўна развіваць кантакты з нашай краінай. Ён адзначыў, што ў Кеніі і Беларусі аднолькавыя падыходы да сучаснага шматпалярнага светапарадку, развіцця дружалюбных і раўнапраўных адносін, узаемавыгаднага супрацоўніцтва на карысць народаў дзвюх краін.

● Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Ала Смаляк удзельнічала ва ўрачыстым адкрыцці спецыялізаванага кабінета магнітна-рэзананснай тамаграфіі і рэнтгенаперацыйнай з высокатэхналагічным ангіяграфічным комплексам у Гомельскім абласным клінічным кардыялагічным цэнтры. «Гэта яркае сведчанне рэалізацыі задачы аб тым, што самыя сучасныя, самыя перадавыя тэхналогіі, інавацыі павінны быць даступныя для ўсіх жыхароў нашай краіны, — кажучы аб значнасці падзеі, падкрэсліла парламентарый. — І такая задача ў краіне выконваецца дакладна, паслядоўна. На гэта накіроўваюцца вялікія сродкі». Па словах сенатара, у Гомельскім кардыялагічным цэнтры кваліфікаваную кардыялагічную, кардыяхірургічную, рэнтгенэндаваскулярную, ангіялагічную дапамогу штогод атрымліваюць тысячы жыхароў з розных пунктаў рэгіёна. «Высокі прафесіяналізм медработнікаў установы ў спалучэнні з перадавым абсталяваннем дадуць магчымасць яшчэ больш умацаваць здароўе людзей, здароўе нацыі, што з'яўляецца важнай каштоўнасцю для дзяржавы, важным складнікам яе бяспекі», — лічыць Ала Смаляк.

● Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Людміла Сапега правяла асабісты прыём грамадзян і прамую тэлефонную лінію ў Добрушскім раённым выканаўчым камітэце. Падчас яе да сенатара паступіў зварот наконт устанаўлення для маці статусу члена сям'і ваеннаслужачага, які загінуў у гады Вялікай Айчыннай вайны. Людміла Сапега ўзяла сітуацыю на асабісты кантроль. Жыхар г. Добруша ўзняў пытанне аб аднаўленні дарогі да месцаў пахавання жыхароў в. Зарадзвінне. Сенатарам дадзены адпаведныя даручэнні. Пытанне знаходзіцца на кантролі. «У нашай краіне наладжана цесная ўзаемная сувязь паміж грамадзянамі і органамі ўлады ўсіх узроўняў, — адзначыла Людміла Сапега. — Жыццё чалавека складаецца з дробязяў, якія ў той ці іншай ступені адбіваюцца на яго светаадчуванні. Тым больш што часам для вырашэння праблемы, якая хвалюе чалавека, цалкам дастаткова шчырага ўдзелу і ведання дзейнага заканадаўства. Чуць адзін аднаго, дапамагаць адзін аднаму, разам вырашаць выяўленыя праблемы — гэта і ёсць асноўныя прыкметы таго, што прынята называць сацыяльным партнёрствам паміж грамадствам і дзяржавай».

**Падрыхтавала Вераніка КАНЮТА.**

# Аснова харчовай бяспекі

## Меліярацыйная галіна атрымала новае жыццё

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Леанід ЗАЯЦ абмеркаваў з генеральным дырэктарам дзяржаўнага аб'яднання «Белводгас» Дзмітрыем КАЛДАБАЕВЫМ вынікі выканання работ па меліярацыі зямель і задачы на перспектыву.**

«Фонд меліяраваных земляў — вялікае багацце для нашых земляробаў і краіны ў цэлым. Гэта важная аснова для фарміравання харчовай бяспекі. Няма ніводнага раёна без такіх палеткаў», — адзначыў парламентарый.

Кіраўніком дзяржавы напрыканцы 2022 года была пастаўлена задача па павелічэнні тэмпаў выканання меліярацыйных работ і ўключэнні ў сельскагаспадарчы абарот у перыяд з 2023-га да 2025 год 330 тысяч гектараў меліяраваных зямель (штогод па 110 тысяч гектараў).

Дзякуючы аказанай дзяржаўнай падтрымцы, у 2023-м было ўведзена ў сельскагаспадарчы абарот 110 тысяч гектараў, летась — 110,8 тысячы гектараў. Толькі ў мінулым годзе на гэтыя мэты з рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў накіравана больш за 525 мільёнаў рублёў.

Ажыццяўляецца тэхнічнае пераабсталяванне меліярацыйных арганізацый: ім з падтрымкай дзяржавы летась пастаўлена 391 адзінка тэхнікі. Тэхпарк падтрымліваецца ў належным стане, прымаюцца меры па своечасовым рамонце. У Барысаўскім раёне створана новая меліярацыйная арганізацыя. Гэта новыя працоўныя месцы.

Меры, што прымаюцца дзяржавай, аказалі станоўчы эфект. Меліярацыйная галіна, па сутнасці, атрымала новае жыццё. За 2023 года сярэдняспісачная колькасць работнікаў меліярацыйнага комплексу скарачалася штогод у сярэднім 300—500 чалавек. Гэты працэс быў спынены, колькасць працуючых павялічылася на 436 чалавек, па выніках мінулага года станоўчая дынаміка захоўваецца. Адзначаецца рост заработнай платы — летась яна ўзрасла на чвэрць да ўзроўню 2023-га.

Як падкрэсліў Леанід Заяц, задача аграрыяў — забяспечыць рацыянальнае выкарыстанне меліяраваных зямель, у першую чаргу пакрытых драўнінна-хмызняковай расліннасцю, атрыманне максімальнай аддачы. З 2021 года дадаткова ўцягнута ў сельскагаспадарчае абарачэнне звыш 46 тысяч гектараў такіх палеткаў.

Сёлета перад меліярацыйнымі арганізацыямі пастаўлена задача аб выкананні заданняў па меліярацыі зямель на ўзроўні не менш чым 110 тысяч гектараў. Прадугледжана адпаведнае фінансаванне, у тым ліку набыццё неабходнай тэхнікі з дзяржаўнай падтрымкай.

Сенатар звярнуў увагу Дзмітрыя Калдабаева на тое, што пастаўленыя перад галіной задачы дадуць магчымасць забяспечыць выкананне даручэння кіраўніка дзяржавы ў поўным аб'ёме. Таксама неабходна актыўна падключыцца да рэалізацыі мерапрыемстваў у рамках Года добраўпарадкавання. У прыватнасці, меліярацыйныя арганізацыі павінны ўзяць удзел у зносе неэксплутаваных сельскагаспадарчых аб'ектаў, каб уключыць у абарот адпаведныя плошчы.

# «ТРЭБА ЗАЦІКАВІЦЬ ЧАЛАВЕКА БЫЦЬ ТВАІМ ПАМОЧНІКАМ»

## Народныя выбраннікі Магілёўшчыны заахвочваюць жыхароў удзельнічаць у развіцці сваіх населеных пунктаў

**Год якасці стаў прадвеснікам пяцігодкі якасці. Сёлета акцэнт робіцца на добраўпарадкаванні — тэме, добра вядомай усім дэпутатам. Яны, як сувязное звяно паміж народам і ўладай, маюць шмат цікавых напрацовак у такім кірунку. Старшыня Магілёўскага абласавета, член Савета Рэспублікі Аляксандр ГАРОШКІН ахвотна падзяліўся думкамі на гэты конт.**



***— Аляксандр Рыгоравіч, на апошняй сесіі мінулага года абласавет зацвердзіў праект бюджэту Магілёўскай вобласці на 2025 год. У ім шмат увагі ўдзяляецца развіццю сацыяльных праектаў, у тым ліку накіраваных на паляпшэнне жыцця сельскіх жыхароў. Гэта невыпадкова?***

— Аналізуючы работу дэпутатаў усіх узроўняў за мінулы год, мы зрабілі зрэз пытанняў, з якімі насельніцтва да нас звярталася. Асноўныя праблемы датычыліся добраўпарадкавання прыдамавых тэрыторый, рамонту пешаходных пераходаў, дарог, якасці пітной вады асабліва ў невялікіх населеных пунктах... Мы ўсе гэтыя пытанні акумулявалі і звярнуліся да выканаўчай улады. Нас пачулі і губернатар, і яго намеснікі. У бюджэт 2025 года якраз закладзены фінансавыя рэсурсы, якія пры планамерным удумлівым іх выдаткаванні дапамогуць нам знясць шматлікія пытанні. Прадугледжаны сродкі на рамонт дарог і прыдамавых тэрыторый. Выдзелены грошы і на рамонт калодзежаў, паколькі ў вёсках людзі па-ранейшаму імі карыстаюцца. Ёсць упэўненасць, што ЖКГ, выкарыстоўваючы гэтыя сродкі, палепшыць стан важных для насельніцтва аб'ектаў. А дэпутацкі корпус пракантралюе, каб грошы былі зрасходаваны па прызначэнні і рацыянальна. У бюджэце ёсць артыкул і на добраўпарадкаванне грамадскіх могілак. Леташняя стыхія нанесла шмат шкоды, у тым ліку і на месцах пахавання. Усё гэта — у полі зроку дэпутацкага корпуса. Будзем наводзіць парадак.

***— Мінулы год стаў першым у рабоце дэпутатаў 29-га склікання. Былі выпрацаваны новыя метады і формы работы з насельніцтвам. Калі ласка, раскажыце пра іх.***

— Як кажа наш Прэзідэнт, мы не павінны чакаць міласці ад прыроды, мы павінны самі ўсё ствараць і больш актыўна ўцягваць у гэта наша насельніцтва. Добраўпарадкаванне і стварэнне камфортных умоў жыцця павінны быць не толькі задачай улады, але і шчырым жаданнем людзей. Апошнім часам мы сталі актыўна развіваць грамадзянскія ініцыятывы, у рэалізацыі якіх людзі будуць прымаць непасрэдны ўдзел. Фінансаванне праекта часткова бярэ на сябе дзяржава. Такім чынам мы будуем дзіцячыя пляцоўкі, уладкоўваем прыдамавыя тэрыторыі, крыніцы — робім тое, што людзям сапраўды неабходна. Практыка паказвае, калі жыхары самі ўдзельнічаюць у справе, зробленае больш шануецца і захоўваецца.

***— Добры водгук у насельніцтва атрымала такая форма работы, як адзіны дзень Саветаў.***

— Так. Яна вельмі эфектыўная. У адзін дзень на тэрыторыі раёна праводзяць прыёмы старшыні сельскіх, раённых, абласных Саветаў, сенатары і дэпутаты Палаты прадстаўнікоў. Прыёмы адбываюцца ў розных месцах. Пасля мы збіраемся ў райцэнтры і абмяркоўваем тыя праблемы, з якімі да нас звярталіся. І адразу ж бачна праблема раёна. Напрыклад, высвятляецца, што не ўсё ў парадку з гандлёвым абслугоўваннем. Значыць, гэта вузкае месца і мы працуем над ім. Такі прыём грамадзян дазваляе зрабіць аб'ектыўны зрэз тых праблем, якія існуюць.

***— Апошнім часам народ часта звяртаецца ў мас-медыя, каб падзякаваць дэпутатам за тое, што з іх дапамогай праблемы хутчэй вырашаюцца. У чым асаблівасць работы?***

— Для мяне дэпутацкая дзейнасць пачалася менш чым год таму. Але 38-гадовы вопыт маёй армейскай службы дазволіў зрабіць выснову: мы павінны не толькі паставіць нейкую задачу, мы павінны пракантраляваць яе выкананне. Толькі тады, калі праблема бярэцца на кантроль, усё выконваецца. Мая пазіцыя: самы галоўны скаржнік у раёне павінен быць сябрам дэпутата. Што я маю на ўвазе? Трэба зацікавіць чалавека быць тваім памочнікам. Каб да яго ішлі людзі, а ён будзе ставіць гэтыя пытанні перад мясцовай уладай і дапамагаць іх вырашаць. Правіла нумар два — дэпутат павінен быць сумленным. Нельга хлусіць, абяцаць тое, што не зробіш. Я, напрыклад, заўсёды пытаюся ў выканаўцаў, колькі ім спатрэбіцца часу на закрыццё праблемы. І абавязкова прыеду ў той дзень асабіста, каб паглядзець, ці ўсё выканана.

Чым больш адказна мы, кожны з нас, будзем рабіць сваю работу, тым больш гарантый таго, што краіна будзе незалежнай. Пра гэта пастаянна гаворыць Прэзідэнт, заклікаючы кожнага добра і якасна рабіць сваю справу. Мы ўсе павінны працаваць сумленна.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
***Фота з архіва Магілёўскага абласавета.***


**РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)**

информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Агрокомбинат «Скидельский».

**Аукцион состоится 10.02.2025 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71**

| Лот № 1 | |
|---|---|
| **Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона** | **ЛОТ 1:** капитальное строение, инв. № 412/С-27010 (назначение – здание специализированное для бытового обслуживания населения, наименование – здание бани), площадью 180,9 кв. м, расположенное по адресу: Мостовский р-н, Дубненский с/с, 33 около д. Заполье.<br>ЛОТ 1 расположен на земельном участке с кадастровым номером 424081700001000293 (назначение – для строительства и обслуживания здания бани), площадью 0,2359 га по адресу: Мостовский р-н, Дубненский с/с, 33 около д. Заполье. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земли, находящиеся в водоохранных зонах рек и водоемов, код – 2.4, площадью 0,2359 га; земли , находящиеся в охранных зонах электрических сетей, код – 5.2, площадью 0,0870 га; земли, находящиеся в придорожных полосах автомобильный дорог, код – 7.1, площадью 0,2359 га.<br>**Условия аукциона:**<br>- оплата за капитальное строение должна быть внесена в течение 90 (девяноста) календарных дней с даты заключения договора;<br>- обязанности подписания и подачи в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» заявления о государственной регистрации и документов, необходимых для осуществления государственной регистрации договора купли-продажи, и основанного на нем права собственности на капитальное строение возлагается на покупателя;<br>- расходы по удостоверению договора купли-продажи капитального строения в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» несет покупатель. |
| **Начальная цена продажи** | 7 560 р. (семь тысяч пятьсот шестьдесят рублей) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 756 р. (семьсот пятьдесят шесть рублей) |
| **Реквизиты для перечисления задатка** | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Место, дата и время окончания приема заявлений** | Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18.<br>Последний день приема заявлений – 06.02.2025 г. до 15.00 |
| Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 21.11.2024 | |
| Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony/ | |



ООО «Деловая оценка» (организатор аукциона) по поручению Добрушского РайПО (продавец) извещает о проведении **11 февраля 2025 года** открытого повторного аукциона по продаже имущества в 11-00 часов по адресу:

г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

**Лот № 5:** Капитальное строение с инв. № 311/С-53371, общей площадью 140,7 кв. м, наименование – магазин № 27, назначение – здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности: Б1/к – Пристройка, 1 – Уборная, А1/к – Магазин, а – Калитка, б – Ограждение, в – Ограждение, г – Ворота, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 321250100001002939 площадью 0,0308 га, расположенное по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, г. Добруш, ул. Советская, 67А. Капитальное строение сдано в аренду по договору аренды.

Лот включает ТОРГОВЫЕ РЯДЫ, РЫНОК, ФАРФ. 3-Д, инв. №452/3662, демонтаж и вывоз осуществляется силами и за счет покупателя. **Начальная цена** продажи без НДС – 2 416,27 бел. руб. **Задаток** – 24,16 бел. руб.

Расходы по приведению в надлежащий вид всей необходимой документации, государственной регистрации договора купли-продажи и перехода права на предмет аукциона возлагаются на Победителя аукциона.

**Продавец: Добрушское РайПО**, г. п. Тереховка, ул. Вокзальная, 47. Конт. тел.: +375 232 34-98-92, +375 44 590-84-01.
**Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота в фиксированной сумме.**
**Для участия в аукционе необходимо:** **1**. Оплатить задаток на расчётный счёт **Организатора аукциона ООО «Деловая оценка»: р/с BY60BELB30121322650030226000 в филиале ОАО «Банк БелВЭБ», г. Гомель, пр-т Ленина, 10, БИК BELBBY2X, УНП 490870026.**
**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни **с 10-00 до 13-00** и **с 14-00 до 17-00** от даты опубликования настоящего извещения. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 10.02.2025 г. в 16.00.** Порядок участия и проведения аукциона с перечнем необходимых документов опубликован на сайте www.deloocenka.by.
**Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за 3 (три) дня до его проведения.** Единственный участник имеет право приобрести лот с шагом 5 %. Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; стоимость, сформированная в результате аукциона, должна быть выплачена продавцу в течение **30 (тридцати) календарных дней** с момента проведения торгов. Возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет окончательной стоимости предмета оценки. Указанные объекты никому другому не проданы, не заложены, под запретом не состоят, судебного спора о них не имеется, других владельцев нет. Проводится аукцион в соответствии с Положением общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» «О порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части)». **Конт. тел. организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62.**

**ОТЧЕТ Местного благотворительного культурно – исторического фонда памяти Первой мировой войны «Кроки» об использовании средств и имущества фонда за 2024 г.**

УНП 691150277

Количество учредителей – 2.
Остаток средств на счетах по состоянию на 1.01.2024 г. – 0,18 руб.
Доходы за 2024 год всего: 365,36 руб.,
в том числе: добровольные взносы – 365,00 руб.; % банка – 0,36 руб.
Расходы за 2024 год всего: 300,26 руб.
в том числе: на административно-хозяйственные цели – 241,76 руб.
на общественно-полезные цели 58,50 руб.
Остаток средств на счетах по состоянию на 1.01.2025 г. – 65,28 руб.
Долгосрочные активы: 14 851,81 руб.
Краткосрочные активы: 4 803,38 руб.
Предпринимательская деятельность не велась, унитарные предприятия и хозяйственные общества не создавались.
Расходование денежных средств на деятельность, не соответствующую целям и задачам, предусмотренным уставом фонда, не производилось.

**ЗАО «БелБанкротАукцион»,**

организатор торгов по продаже имущества коммунального унитарного предприятия «Стародорожский ремонтно-строительный участок» (УНП 690724428), объявляет о проведении **03.03.2025 г.** в 10.00 публичных торгов по адресу: г. Минск, ул. Гурского д. 22б, ком. 501.

**Перечень предметов торгов публично размещен на сайте: bankrot-torg.by.**

Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочее время, предварительно связавшись с контактным лицом по тел. 80296083100;

Продавец: Коммунальное унитарное предприятие «Стародорожский ремонтно-строительный участок», тел. 80296953010;

Организатор торгов: ЗАО «БелБанкротАукцион», 220015, г. Минск, ул. Гурского д. 22б, ком. 501; 80296083100; contact@bankrot-torg.by.

Для участия в торгах необходимо уплатить задаток в размере 10 % от начальной стоимости лота не позднее **28.02.2025 г.** на р/с BY16 UNBS 3012 0116 4010 0000 8933, в ЗАО «БСБ Банк», БИК UNBSBY2X, УНП 193417684, получатель — ЗАО «БелБанкротАукцион». Назначение платежа: задаток за участие в торгах по лоту № _ (номер лота).

Заявления на участие в торгах принимаются с 9.00 **30.01.2025** по 17.00 **28.02.2025** по адресу: г. Минск, ул. Гурского д. 22б, ком. 501. Перечень документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах:

- свидетельство о государственной регистрации юр. лица (ИП);
- устав юридического лица;
- решение высшего органа управления юридического лица об участии в торгах, о заключении договора купли-продажи предмета публичных торгов.
- для физических лиц: 31, 32, 33 стр. паспорта.

Организатор торгов может отказаться от проведения торгов не позднее чем за 5 дней до даты проведения торгов.

Победителем торгов признается лицо, предложившее наивысшую цену за предмет торгов.

Оформление результатов торгов в день проведения торгов.

В случае признания торгов несостоявшимися предмет торгов может быть продан единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах, при его согласии, по начальной цене, увеличенной на 5 %.

Затраты на организацию и проведение торгов составили: стоимость размещения объявления в газете «Звязда» согласно счет-фактуре, аукционный сбор по лотам №№ 17,25 — 5 % от цены реализации предмета торгов без учета НДС (НДС 20 %), по остальным лотам 7 % от цены реализации предмета торгов без учета НДС (НДС 20 %).

Дополнительные условия: нет.

Срок подписания договора купли-продажи: в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Срок оплаты по договору купли-продажи: в течение 10 календарных дней с даты проведения торгов.

**РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)**

информирует о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего открытому акционерному обществу «Красносельский торг».

Аукцион состоится 28.02.2025 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209.
Телефон для справок: 55-87-71

| Лот № 1 | |
|---|---|
| Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона | ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 410/С-31389 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин № 2 «Промтовары»), обшей площадью 138,1 кв. м, расположенное по адресу Гродненская обл., Волковысский р-н, Красносельский с/с, г. п. Красносельский, ул. Школьная, 7. Лот № 1 расположен на земельном участке с кадастровым № 420855700001000201, площадью 0,0462 га (назначение – земельный участок для размещения объектов иного назначения), находящемся по адресу: Гродненская обл., Волковысский р-н, Красносельский с/с, г. п. Красносельский, ул. Школьная, 7. |
| Условия проведения аукциона | - возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца по оказании услуг по независимой оценке в размере 416,30 руб.; - возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 5 % от конечной цены продажи объекта; - срок заключения договора купли-продажи с победителем торгов – в течение 20 (двадцати) календарных дней после проведения торгов; - условия оплаты – в течении 30 (тридцати) календарных дней с момента заключения договора купли-продажи. Обременения со стороны третьих лиц в виде аренды: на капитальное строение, инв. № 410/С-31389 сроком по 31.12.2025 г. |
| Начальная цена продажи | **Лот № 1:** 61 200 руб. (шестьдесят одна тысяча двести рублей) с учетом НДС. |
| Сумма задатка | **Лот № 1:** 6 120 руб. (шесть тысяч сто двадцать рублей) |
| Реквизиты для перечисления задатка | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| Место, дата и время окончания приема заявлений | Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед – с 12.30 до 13.18. Последний день приема заявлений – 26.02.2025 г. до 15.00 |

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony/

У СВАЕЙ АКРУЗЕ

# «ПЫТАННІ ДОБРАЎПАРАДКАВАННЯ — АДНЫ З ПРЫЯРЫТЭТНЫХ»

## З чым прыходзяць выбаршчыкі да свайго дэпутата

**КОЖНЫ месяц адзін тыдзень дэпутаты Палаты прадстаўнікоў праводзяць у сваіх акругах. Менавіта тут яны працуюць са сваімі выбаршчыкамі, праводзяць сустрэчы ў калектывах і займаюцца тымі пытаннямі, што да іх паступілі.**

**Аб тым, якія звароты самыя складаныя і як расставіць прыярытэты пры іх вырашэнні, расказала дэпутат Палаты прадстаўнікоў па Гродзенскай-Кастрычніцкай акрузе № 50, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Алена ПАТАПАВА.**



На думку парламентарыя, важна разумець, чым жыве сучаснае грамадства, яго задачы і праблемы, і па магчымасці вырашаць іх на месцах альбо выносіць на заканадаўчы ўзровень. Ёсць звароты, якія патрабуюць глыбокай прапрацоўкі. Так, з працоўнага калектыву паступіла пытанне аб рамонце пад'язных дарог да прадпрыемства. Зараз яно на кантролі, паколькі патрабуе падключэння і гарадскога бюджэту, і дарожных службаў, і аўтаінспекцыі.

Разам з тым некаторыя такія звароты ўдалося вырашыць.

— Адна жанчына звярнулася з пытаннем вулічнага руху. У ціхім некалі гарадскім мікрараёне пачалося актыўнае будаўніцтва, адпаведна ўзрос аўтамабільны паток, што стала небяспечным для школьнікаў. Па яе просьбе я звярнулася ў ДАІ, затым да дарожнай службы. На пераходзе ўстанавілі рэльефны пераход, астравок бяспекі. Гэты працэс пазней стаў актыўна развівацца ў горадзе, і цяпер мы бачым менавіта такую арганізацыю руху, — расказала суразмоўніца.

Разам з тым дэпутату важна займацца не толькі глабальнымі пытаннямі, але і дапамагаць канкрэтным людзям у іх бытавым жыцці. У гэтым сэнсе асаблівая ўвага і дэпутатаў, і дзяржавы звяртаецца на сацыяльна ўразлівыя катэгорыі людзей.

— Аднойчы лёс звёў мяне з сям'ёй, дзе выхоўваюцца дзесяць дзяцей. Маці засталася без мужа са складанай праблемай, якая таксама датычыцца добраўпарадкавання. У доме, дзе жыве шматдзетная сям'я, няма падвальнага памяшкання, прыстасаванага пад патрэбы жыхароў, таму ўсе рэчы прыходзіцца захоўваць у трохпакаёвай кватэры. Зразумела, што ў такой сітуацыі складана гаварыць аб парадку... І вось літаральна днямі мне прыйшоў адказ, што пытанне вырашана: дзякуючы адміністрацыі Кастрычніцкага раёна, ЖЭСу дома, сям'і выдзелілі месца ў падвале. З дапамогай прадпрыемства «Гроднажылбуд» зроблена кладка, паліцы, устаўлены дзверы. Цяпер тут можна будзе захоўваць і сезонны абутак, і адзенне, і многае іншае. Мне здаецца важным, калі дэпутаты будуць звяртаць увагу менавіта на такія бытавыя пытанні, якія, магчыма, не паказальныя, але вельмі важныя ў штодзённым жыцці, — лічыць Алена Патапава.

Увогуле звароты грамадзян разнапланавыя. Ёсць прапановы па пасадцы дрэў, хтосьці звяртаецца з просьбай, каб не высякалі дрэвы. Дзесьці трэба адрамантаваць пад'езд, паправіць лесвіцу, устанавіць лаўкі... Усе звароты знаходзяць сваіх адрасатаў, і, нават калі задаволіць просьбу немагчыма, чалавеку даецца абгрунтаваны адказ.

Ёсць у дэпутата і свой падшэфны дзіцячы садок. Алена Патапава прызнаецца, што ёй прыемна бываць менавіта ў дзіцячых установах, бо тут асабліва адчуваецца радасць ад працы. Дзеці вельмі цёпла ўспрымаюць такія сустрэчы. Падчас іх відавочна, якая ўвага ўдзяляецца дзецям з боку дзяржавы, як развіваецца адукацыя. У сваю чаргу, дэпутат таксама імкнецца парадаваць малых. Так, сумесна з арганізацыямі дзіцячаму садку падарылі чатыры сталы для малявання пяском. А пасля чарговага візіту дэпутата напярэдадні Новага года ў дзяцей з'явілася аформленая творчымі работамі сцяна.

Дэпутат пастаянна трымае сувязь з прадстаўнікамі мясцовага самакіравання. Менавіта з іх дапамогай удаецца вырашыць актуальныя для выбаршчыкаў пытанні. Між тым на дэпутата кладзецца і важная задача падчас шырокіх палітычных кампаній, напрыклад выбараў. А гэта вялікая работа з людзьмі, з калектывамі.

— Сёння ёсць пытанне па нацыянальнай бяспецы нашай дзяржавы, абароне яе граніц і суверэнітэту. І я бачу ў людзей, якія жывуць каля заходняй граніцы краіны, заклапочанасць гэтымі пытаннямі. Яны не хочуць ніякіх узрушанняў, людзі сталі больш свядомымі, яны разумеюць, што ўсялякія нашы ўнутраныя хібы робяць нас уразлівымі для знешніх ворагаў, таму гатовы любымі сіламі захоўваць стабільнасць у краіне. Нармальныя людзі імкнуцца зберагчы мір і спакой, — рэзюмуе дэпутат пасыл сваіх выбаршчыкаў.

**Маргарыта УШКЕВІЧ,**
**фота аўтара.**

ТЭОРЫЯ І ПРАКТЫКА

# ЛЮБІЦЬ ПРАЦУ — ШАНАВАЦЬ РАДЗІМУ

## Кіраўнікі маладзёжных парламентаў Брэстчыны вучыліся ў Парахонску

**СЕМІНАР-нарада старшыні Брэсцкага абласнога Савета Ігара БРЫЛЕВІЧА са старшынямі маладзёжных парламентаў пры Саветах дэпутатаў базавага ўзроўню адбыўся ў аграгарадку Парахонск Пінскага раёна.**



І пленарная, і практычная частка семінара была прысвечана жыццёвым арыенцірам маладога пакалення. «Асноўная тэма нашай размовы датычыцца выхавання падрастаючага пакалення, — сказаў напачатку сенатар, старшыня Брэсцкага абласнога Савета Ігар Брылевіч. — Парахонск для сённяшняга мерапрыемства выбраны невыпадкова. Да гэтага пытання тут падыходзяць грунтоўна. ААТ «Парахонскае» дасягнула надзвычай высокіх вынікаў у сацыяльна-эканамічным плане. Цяпер гаспадарка і аграгарадок вядомыя ва ўсёй Беларусі. Па вытворчасці ялавічыны сельгаспрадпрыемства займае першае месца ў краіне. Такія вынікі зусім невыпадковыя. На працягу многіх гадоў тутэйшыя працаўнікі дэманструюць сумленнасць, настрой на стваральную працу, любоў да малой радзімы».

Яшчэ Ігар Брылевіч падкрэсліў, што парахонцы заўсёды разам: разам вырашаюць вытворчыя пытанні, на суботнікі таксама выходзяць разам для таго, каб населены пункт выглядаў яшчэ больш прывабна, разам умеюць культурна адпачываць.

Як сказала аўтару гэтых радкоў **старшыня Маладзёжнага парламента пры Брэсцкім абласном Савеце дэпутатаў Лізавета БАСАЛАЙ,** самыя добрыя ўражанні яны атрымалі ад наведвання вытворчых аб'ектаў ААТ «Парахонскае»: «У рамонтнай майстэрні ідэальны парадак, такі ж, дарэчы, падтрымліваецца на машынным двары, на іншых аб'ектах. Нам паказалі нядаўна ўзведзены ангар для захавання буйнагабарытнай тэхнікі, расказалі пра палівальную ўстаноўку. На палях, дзе яна працавала, атрымалі шэсць укосаў траў. Для многіх маладых людзей, асабліва гараджан, такая экскурсія стала сапраўдным адкрыццём. Мы былі ўражаны сістэмай падтрымкі ўстаноў адукацыі і культуры з боку сельгаспрадпрыемства».

Паводле слоў Лізаветы Басалай, на пасяджэнні круглага стала ўдзельнікі семінара абмеркавалі актуальныя пытанні патрыятычнага выхавання моладзі. Кіраўнікі маладзёжных парламентаў раёнаў шмат чаго ўзялі на заметку, асабліва ў плане працоўнага выхавання дзетак, пачынаючы з дашкольнага ўзросту.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота «Пінскі тэлеграм».**

# НЕ САРОМЕЦЦА БЫЦЬ БЛІЖЭЙ ДА ЛЮДЗЕЙ

## Крычаўскія дэпутаты пра свой вопыт работы з насельніцтвам

**У канцы мінулага года ў Кіраўскім раёне на пашыраным пасяджэнні Прэзідыума Савета Рэспублікі дэталёва былі разгледжаны вынікі работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб у Магілёўскай вобласці. Адзначалася, што іх колькасць за апошнія два гады паменшылася. Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава ўхваліла вопыт крычаўскіх дэпутатаў у гэтым кірунку. Ім на пасяджэнні падзялілася старшыня Крычаўскага райсавета Ірына ПРУДНІКАВА. У нашай размове з народнай выбранніцай мы акцэнтавалі ўвагу на так званых дамінантах гэтай работы.**



На адной хвалі.

### У кожнай мікразоны — свой старшыня

— Орган тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання — гэта не новая форма работы з людзьмі. Магчыма, проста не ва ўсіх яшчэ наладжаны такія шчыльныя стасункі з насельніцтвам, як у нас, — расказвае Ірына Пруднікава. — Пасля выбараў дэпутатаў, згодна з заканадаўствам, выбіраюцца прадстаўнікі і ў ОТГС. Жыхары Крычаўскага раёна гэта ведаюць, і ні для каго такі вопыт не сюрпрыз. У кожным сельсавеце свае старасты, акрамя гэтага, ёсць тры калегіяльныя органы ў аграгарадках. У Крычаве працуе восем мікразон. На іх падзелена ўся тэрыторыя горада, якая на 16 кіламетраў працягнулася ўздоўж Сожа. Усе мікразоны маюць нумар і назву. У кожнай свой старшыня. Усяго на тэрыторыі раёна працуюць 53 старасты сельскіх населеных пунктаў, тры сельскія камітэты, у самім Крычаве — 75 старшых па дамах і 94 старшых па вуліцах.

Ірына Пруднікава адзначае, што такая колькасць актывістаў дапамагае трымаць руку на пульсе. Усе гэтыя людзі карыстаюцца аўтарытэтам у насельніцтва, ведаюць, куды пераадрасаваць пытанні ад народа, кантралююць, каб яны своечасова вырашаліся. Памочнікі дэпутатаў звяртаюцца непасрэдна на тыя прадпрыемствы, у арганізацыі, установы раёна, ад якіх залежыць вынік. Калі нешта не атрымліваецца вырашыць самастойна, пішуць запыты ў райсавет.

— ОТГС — сур'ёзная арганізацыя, яно нават рэгіструецца ў райвыканкаме, — удакладняе суразмоўніца. — Рашэнне аб стварэнні прымаецца на сходзе жыхароў. І кіраўнікі арганізацый і прадпрыемстваў ведаюць, калі яны не зробяць нешта па звароце старшыні мікразоны, то зробяць па нашым. А дэпутаты працуюць у аднной звязцы з выканаўчай уладай. Мэта ва ўсіх адна — каб чалавеку жылося камфортна. Эфект вельмі добры. Шмат пытанняў вырашаецца яшчэ на этапе да райсавета. Да нас даходзяць у асноўным тыя, што патрабуюць фінансавых укладанняў альбо дадатковых дазволаў.

### Камунікацыя дысцыплінуе

Эфектыўна працаваць дэпутатам дапамагае мабільная сувязь. У сацыяльных сетках створана некалькі мэтавых груп па мікразонах, сельсаветах, асобна — дэпутацкая і прэзідыума райсавета. Вельмі зручна і аператыўна. Жыхар адпраўляе сваю заяўку, і яна адразу ж прымаецца ў работу.

Своечасова выяўляць праблемы на сяле мясцовай уладзе дапамагаюць такія папулярныя формы камунікацыі з жыхарамі, як Дзень Савета, Свята вёскі, Цягнік «Клопат». Да сялян у гэтыя дні прыязджаюць усе: прадстаўнікі выканаўчай і прадстаўнічай улады, розных ведамстваў і арганізацый. На парадку дня — і прафілактыка, і медыцынскае абслугоўванне, і інфармаванне насельніцтва пра важныя падзеі ў краіне, і культурная праграма.

Двойчы ў год у мікразонах праводзяцца сустрэчы з насельніцтвам. Удзел у іх бяруць дэпутаты выбарчай акругі, якія ўваходзяць у мікразону; старшыня райвыканкама, яго намеснікі, начальнікі аддзелаў і ўпраўленняў райвыканкама, прадстаўнікі службаў і ведамстваў. У ходзе такіх сустрэч здымаецца шмат пытанняў. Калі немагчыма нешта зрабіць адразу, праблема бярэцца на кантроль і выконваецца ў пэўныя тэрміны.

— Апошнія два гады, калі ідуць вялікія ападкі, адбываецца сур'ёзнае падтапленне асобных участкаў у мікразоне Цэмзавода, — прыводзіць прыклад суразмоўніца. — Райвыканкам збіраецца ў бліжэйшыя гады ў некалькі этапаў вырашыць праблему. Па адным участку ўжо распрацавана неабходная праектна-каштарысная дакументацыя. Сёлета работы ўжо пачнуцца.

### Каб не толькі «дзякуй»

Пераацаніць грамадскую работу старастаў і старшынь мікразон цяжка. Людзі працуюць у асноўным на энтузіязме, а карысць істотная.

Кіраўнік райсавета адзначае, што актыўных людзей заўсёды стараюцца адзначыць. Папулярнасць набыў раённы конкурс на найлепшы пад'езд, добраўпарадкаванне сумежнай тэрыторыі шматкватэрнай забудовы і індывідуальнага жылога дома. У кожнай з трох намінацый адзначаюцца па тры, а часам і болей найлепшых удзельнікаў. Пераможцам уручаюцца прэміі, прычым не толькі на раённым узроўні. Тая ж Савецкая мікразона з Крычава пазалетась заняла трэцяе месца ў вобласці. У 2022 годзе яна была першай. Крычаўскія дэпутаты ўжо звярталіся ў аблсавет, каб узаконіць пытанне з аплатай найбольш актыўным прадстаўнікам мясцовага самакіравання. Аблсавет, у сваю чаргу, звярнуўся ў Савет Рэспублікі. У раёне спадзяюцца, што іх падтрымаюць.

— Вельмі правільна было б матэрыяльна заахвочваць такіх людзей, — лічыць Ірына Пруднікава. — Карысць, якую яны прыносяць грамадству, неацэнная. Не сумняваюся, што нават гэтыя грошы яны ўклалі б у агульную справу.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

**Фота з архіва райсавета.**

*г. Крычаў.*


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона / оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | ОАО «Агат — электромеханический завод», 220114, г. Минск, пр-т Независимости, 115, каб. 317 |

**Предмет электронных торгов: оборудование (бывшее в употреблении), расположенное по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, 115 (территория предприятия)**

| Лот № | Инв. номер | Наименование | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1. | 70024551 | Перегрузочное устройство ЛТ 5133 | **5204,70** |
| 2. | 42320014 | Вибромашина ВМ100 | **500,00** |
| 3. | 42303068 | Автомат фасонно-продольного точения TORNOS M7 | **814,20** |
| 4. | 42303069 | Автомат фасонно-продольного точения TORNOS M7 | **814,20** |
| 5. | 43551737 | Многокомпонентный электрохимический газоанализатор Каскад-Н 41.2 | **2940,00** |
| 6. | 43372913 | Частотомер электронно-счетный ЧЗ-34 | **483,84** |
| 7. | 43372916 | Частотомер электронно-счетный ЧЗ-34 | **483,84** |
| 8. | 43374617 | Частотомер электронно-счетный ЧЗ-54 | **1183,68** |
| 9. | 43375464 | Частотомер электронно-счетный ЧЗ-54 | **1183,68** |
| 10. | 43375627 | Частотомер электронно-счетный ЧЗ-64 | **2376,00** |
| 11. | 43375979 | Частотомер электронно-счетный ЧЗ-64 | **2376,00** |
| 12. | 43375983 | Частотомер электронно-счетный ЧЗ-64 | **2376,00** |
| 13. | 43374833 | Измеритель комплексных коэффициентов передачи Р4-11 | **1425,60** |
| 14. | 43374824 | Генератор Г5-63 | **302,40** |
| 15. | 43376016 | Генератор Г5-63 | **302,40** |
| 16. | 43376030 | Генератор Г5-63 | **302,40** |
| 17. | 43376031 | Генератор Г5-63 | **302,40** |
| 18. | 43376142 | Генератор Г5-63 | **302,40** |
| 19. | 43376143 | Генератор Г5-63 | **302,40** |
| 20. | 43375068 | Генератор Г5-56 | **1512,00** |
| 21. | 43375674 | Генератор Г5-56 | **1512,00** |
| 22. | 43376316 | Генератор Г3-123 | **1166,40** |
| 23. | 43376407 | Генератор Г3-123 | **1166,40** |
| 24. | 43374262 | Осциллограф С1-67 | **198,72** |
| 25. | 43374368 | Осциллограф С1-67 | **198,72** |
| 26. | 43374372 | Осциллограф С1-67 | **198,72** |
| 27. | 43374421 | Осциллограф С1-68 | **224,64** |
| 28. | 43374172 | Осциллограф С1-68 | **224,64** |
| 29. | 43374232 | Осциллограф С1-68 | **224,64** |
| 30. | 43374857 | Осциллограф С1-55 | **233,28** |
| 31. | 43375000 | Осциллограф С1-55 | **233,28** |
| 32. | 43375145 | Осциллограф С1-55 | **233,28** |
| 33. | 43375221 | Осциллограф С1-55 | **233,28** |
| 34. | 43374857 | Осциллограф С1-55 | **233,28** |
| 35. | 43375224 | Осциллограф С1-55 | **233,28** |
| 36. | 42104002 | Холодновысадочный автомат 52ВА | **2050,00** |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется участником электронных торгов в белорусских рублях на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32, БИК BELBBY2X, ОКПО 378531865000, получатель платежа — ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638.

**Срок подписания договора купли-продажи:**
**10 (десять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов.

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **10 (десяти)** календарных дней после заключения договора купли-продажи.

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by.**

Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение от **8 % до 10 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов.

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия.

Предыдущее извещение опубликовано в г. «Звязда» от 27.12.2024 г.

**Дата и время начала и окончания электронных торгов**: **13.02.2025 г. с 11.00 до 13.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов.

**Дата и время окончания приёма заявок**: Заявки на участие в электронных торгах принимаются по **12.02.2025 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by.

| | |
|---|---|
| **Контактные телефоны:** | **Тел: +375 (17) 373 21 33; +375 (44) 704-92-06, Email: info@ipmtorgi.by** |



## РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона)

**извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ООО «АСБ Лизинг» (Продавец).**

Аукцион состоится **14.02.2025 в 14.00**
по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4.

**Лот № 1:** изолированное помещение №1 здания строительного рынка с инв. № 600/D-83134, 1379,9 кв. м. Адрес: Республика Беларусь, Минская обл., Минский р-н, Щомыслицкий с/с, 14/1-1, район аг. Озерцо. Обременения – аренда.
Начальная цена с НДС 20 % – 850 000,00 руб.
Задаток – 50 000,00 руб. Шаг аукциона – 5 %.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – gostorg.by. Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений и задатка – 12.02.2025 в 11.00.

**Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**gostorg.by e-mail: torgi@ino.by**



Мясцовае Самакіраванне
Газета для выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых Саветаў

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў):
zvarot@zviazda.by

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15**
**ад 17 лютага 2009 года выдадзена**
**Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**Дырэктар — галоўны рэдактар**
**АНУФРЫЕВА**
**Вольга Аляксандраўна.**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 311 17 35;

**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 03.04.2004. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.**

**Тыраж 12 781. Нумар падпісаны ў 19.30**
**28 студзеня 2024 года.**

**Извещение об открытом аукционе по продаже имущества ОАО «Автобусный парк г. Гродно» г. Гродно 4 марта 2025 года**

| | |
|---|---|
| Лот № 1 | **Изолированное помещение с инвентарным номером 400/D-229912 по ул. Дзержинского, 106-3** (наименование: административное помещение; назначение: административное помещение) площадью 40,7 кв. м<br>**Изолированное помещение с инвентарным номером 400/D-229911 по ул. Дзержинского, 106-2** (наименование: санитарно-бытовое помещение; назначение: помещение санитарно-бытового назначения) площадью 7,1 кв. м<br>Изолированные помещения расположены на первом этаже двухэтажного капитального строения.<br>**Капитальное строение с инвентарным номером 400/С-169649 по адресу: Гродненская обл., г. Гродно, 683, канализационная сеть** (наименование: канализационная сеть; назначение: сооружение специализированное коммунального хозяйства) протяжённость 107,9 м, составные (конструктивные) элементы сооружения согласно техническому паспорту: трубопровод, колодец<br><br>Имущество расположено на земельном участке с кадастровым номером 440100000002002789 по ул. Дзержинского, д. 106 площадью 0,1468 га (имущественное право земельного участка – право постоянного пользования, доля 79/250)<br>Территория относится к функциональной зоне «П-д» – смешанная производственно-деловая застройка, согласно назначению здания и расположению функциональной зоны, возможно расположение объектов административно-делового назначения.<br><br>**Начальная цена продажи: 134 060,87 рубля (с учетом НДС 20 %)**<br>Сумма задатка: 13 400,00 рублей |
| Продавец | **ОАО «Автобусный парк г. Гродно», г. Гродно, ул. Победы, 16, тел. 8 (152) 71-32-01 (по вопросам осмотра имущества)** |

Организатор аукциона: **Коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», г. Гродно, пл. Ленина, д. 2/1, тел. 8 (152) 62-60-55, 62-60-56**

Дата и время проведения аукциона: **4 марта 2025 года**, **12:00**

Место проведения аукциона:
**г. Гродно, пл. Ленина, д. 2/1, актовый зал**

Место приема заявлений и прилагаемых к ним документов:
**г. Гродно, пл. Ленина, д. 2/1, кабинет № 117**

Дата и время начала приема документов:
**3 февраля 2025 года 8.00;**
дата и время окончания приема документов:
**26 февраля 2025 года 17.00**

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

- копии платежных поручений об оплате задатка на расчетный счет BY24AKBB30120000418104000000 Гродненское областное управление № 400 ОАО АСБ «Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY2X, УНП 590727594, код назначения платежа 40901, получатель — коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости»;

**юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь** — копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; **иностранным юридическим лицом** — легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; **представителем юридического лица Республики Беларусь** — доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); **представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь** — нотариально удостоверенная доверенность; **представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица** — доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица — также документ, подтверждающий его полномочия.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона. Торги в отношении предмета аукциона проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов.

Срок заключения договора купли-продажи — не позднее двадцати дней со дня завершения торгов.

Оплата предмета торгов — по договоренности сторон.

Победитель обязан возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, в течение 3 рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона, а также выплатить организатору аукциона вознаграждение в размере 4 % от цены продажи предмета торгов.

Извещение опубликовано на сайтах: Государственного комитета по имуществу — au.nca.by, Гродненского городского исполнительного комитета — grodno.gov.by, коммунального унитарного предприятия по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» — gcn.by



**ЗАО «Центр промышленной оценки»** (УНП 191021390) –
проводит третьи повторные торги
в форме открытого аукциона по продаже:

**ОБОРУДОВАНИЯ, ТРАНСПОРТНЫХ СРЕДСТВ**

(бывших в употреблении), принадлежащих
**ОАО «Климовичский ликеро-водочный завод»**
(Антикризисный управляющий — ООО «СтанИБор» (УНП 491343813) — производство по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) № 111-2/Б/2017).

С порядком регистрации для участия в торгах, общими правилами проведения можно ознакомиться на www.bankrot.gov.by либо на ЭТП «ИПМ-Торги» (ipmtorgi.by) и по тел. +375 29 821-47-15.

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 13.02.2025 с 09.00 до 16.00.**
Заявки на участие в электронных торгах принимаются с 9.00 29.01.2025 по 12.02.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by


# НА КРАІ ЗЯМЛІ



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— У 2006 годзе наша краіна далучылася да Дагавора аб Антарктыцы, — распавядае **начальнік Рэспубліканскага цэнтра палярных даследаванняў НАН Беларусі Уладзімір РЫЖЫКАЎ**. — Дагавор ад 23 чэрвеня 1961 года рэгулюе ўсю дзейнасць за 60-м градусам паўднёвай шыраты, гэта значыць, на кантыненце, прылягаючых тэрыторыях і астравах. Яна забараняе ў гэтым «сусветным запаведніку» розныя віды дзейнасці, акрамя навуковай.

За гэтыя гады, адзначыў навуковец, уведзена ў строй Беларуская антарктычная станцыя «Гара Вячэрняя». Сёння наша рэспубліка ў ліку больш чым 50 краін, якія вядуць на шостым кантыненце даследчую дзейнасць, і адна з нямногіх дзяржаў, якія маюць там станцыі — у адным шэрагу з Расіяй і Кітаем, Аргенцінай, Чылі, ЗША, Вялікабрытаніяй і іншымі. Станцыі бываюць сезонныя і тыя, дзе можна працаваць увесь год. Беларуская — сезонная: экспедыцыя адпраўляецца туды падчас арктычнага лета. А яно ў Паўднёвым паўшар'і якраз цяпер.

## НЕ ЗАЎТРА, А ЗАРАЗ

— Навуковая праца вядзецца па шэрагу кірункаў, якія замацаваны ў дзяржаўнай праграме — ужо чацвёртай, і цяпер фарміруецца пятая, — тлумачыць Уладзімір Рыжыкаў. — Перш за ўсё, гэта тыя даследаванні, што выконваюць і іншыя дзяржавы (іх курыруе Навуковы камітэт па вывучэнні Антарктыкі (SCAR): біялагічныя, вывучэнне фізікі атмасферы, шэраг кірункаў па ахове навакольнага асяроддзя. Даследаванні звязаны таксама з лядовым становішчам, вывучэннем лядовага керну донных адлажэнняў. Іх спектр вельмі шырокі.

Што датычыцца прыкладных аспектаў антарктычных даследаванняў, іх таксама шмат, падкрэслівае суразмоўца.

— Вылучаны мікраарганізмы, якія сустракаюцца толькі на гэтым кантыненце, яны прыстасаваліся да экстрэмальных кліматычных умоў (нізкіх тэмператур, высокага ўльтрафіялету) і выдзяляюць асаблівыя біялагічныя рэчывы. На іх аснове Інстытут мікрабіялогіі НАН Беларусі распрацаваў прэпарат «Вегетацін», які ўжо сёння эфектыўна выкарыстоўваецца на палях краіны для «экалагічна чыстай» абароны сельскагаспадарчых раслін ад хвароб і павышэння ўраджайнасці культур.

Адзін з кірункаў біядаследаванняў — вылучэнне біяактыўных рэчываў антарктычных раслінных супольнасцяў. Гэта мохападобныя і лішайнікі, яны таксама ўнікальныя і адрозніваюцца ад «сародзічаў» з любой іншай часткі свету са стрыечныя, а не родныя «браты».

— Пілотны праект звязаны з хімічным складам гэтых мохападобных і лішайнікаў, вылучэннем з іх рэчываў, каштоўных для фармацэўтычнай прамысловасці, і распрацоўкай інавацыйных прэпаратаў, — канкрэтызуе вучоны. — Так, атрыманы рэчывы, якія паскараюць згусальнасць крыві. На іх аснове будуць распрацоўвацца прэпараты для гаення ран, рэабілітацыі ў пасляаперацыйны перыяд. Інстытутам эксперыментальнай батанікі НАН Беларусі, Інстытутам біяарганічнай хіміі Акадэміі навук сумесна з РНПЦ анкалогіі і РНПЦ дзіцячай анкалогіі вядзецца праца, накіраваная на стварэнне прэпаратаў на аснове вылучаных з арктычнай флоры рэчываў для лячэння і — галоўнае — папярэджання анкалагічных захворванняў.

## ЯК Я ПРАВЁЎ ЛЕТА

Узімку на антарктычным узбярэжжы рэдка бывае цяплей за мінус 40 °С, а ў цэнтры кантынента зарэгістраваны тэмпературны мінімум на ўзроўні мінус 89,9 °С. Але і летам Антарктыда не дабрэйшая да людзей, хоць зрэдку тут бывае нават «плюс» — і гэта стварае дадатковыя небяспекі. Раставанне леднікоў, непрыкметныя расколіны ў шматтонных ільдах, апоўзні, якія пагражаюць зваліцца са стромых скал у акіян, пераменлівы ландшафт (калі ўкатаная дарога «без папярэджання» становіцца небяспечнай). Плюс завеі і ўраганныя вятры.

У арктычныя экспедыцыі адпраўляюцца, як правіла, правераныя людзі, а ўзначальвае іх — усе 17 экспедыцый — найбольш вопытны беларускі палярнік Аляксей Гайдашоў. Бо кожны далёкі выхад са станцыі, любое даследаванне за яе межамі (а яны праводзяцца ў тым ліку на «прыпаяным лёдзе») — выпрабаванне, якое патрабуе сур'ёзнай падрыхтоўкі. Нядаўна беларуская экспедыцыя пабывала ў раёне Антарктыды, дзе амаль не ступала нага чалавека — там была праведзена навуковая работа, узятыя ўзоры і ўсталяваны беларускі сцяг.

— Па прамой гэта каля 200 км ад «Гары Вячэрняй», але па факце пераадолець на снегаходнай тэхніцы давялося больш за 800 км, у абыход расколін і актыўных зон леднікоў, — тлумачыць начальнік цэнтра палярных даследаванняў.

## ПЫТАННЕ ПРЭСТЫЖУ. І НЕ ТОЛЬКІ

«Насельніцтва» беларускай арктычнай станцыі на сёння — 14 чалавек.

— Інфраструктура станцыі — вытворчыя, тэхналагічныя, лабараторныя і жылыя комплексы, — распавядае Уладзімір Рыжыкаў. — Першы модуль — сувязі і навігацыі — быў дастаўлены суднавай авіяцыяй і ўсталяваны на ўстановачнай платформе ў 2013 годзе. Да гэтага нашы палярнікі ўладкоўваліся на палявой аэрадромнай базе савецкіх часоў, перададзенай Беларусі Расіяй. Гэтыя аб'екты і цяпер у складзе станцыі. Пазней з'явіўся другі, васьмісекцыйны модуль — жылыя і лабараторныя памяшканні. Наступным стаў медыцынскі модуль з найноўшым абсталяваннем: там нават можна праводзіць хірургічныя аперацыі (на шчасце, пакуль гэта не спатрэбілася). Устаноўлена таксама лабараторыя фізікі атмасферы.

На «лядовы кантынент» беларуская экспедыцыя адправілася ў лістападзе, а дадому вернецца толькі ў красавіку (мінулая правяла «ў ільдах» яшчэ больш часу — яна доўжылася з кастрычніка да чэрвеня). І ўвесь гэты час жменька людзей адарваная ад свету. У такіх умовах асабліва цэняцца простыя радасці: магчымасць пагаварыць адзін з адным, з роднымі ў Беларусі.

— Сістэма спадарожнікавай сувязі дазваляе забяспечваць станцыю бесперабойным інтэрнэтам і ў тым ліку тэлевяшчаннем, — кажа суразмоўца.

Такім чынам, беларуская арктычная станцыя — свайго роду «канструктар LEGO». Модулі могуць працаваць як адзіная сістэма або ў аўтаномным рэжыме (такімі модулямі станцыя будзе прырастаць кожныя некалькі гадоў).

— Станцыя ў Антарктыдзе для Беларусі — пытанне прэстыжу, — рэзюміруе суразмоўца. — Але справа не толькі ў гэтым. Наша краіна бярэ ўдзел у даследаваннях кантынента згодна з умовамі Дагавора аб Антарктыцы, які аб'ядноўвае 58 дзяржаў, і пакуль Беларусь мае статус назіральніка. Атрымаўшы кансультацыйны статус, наша краіна зможа ўдзельнічаць у прыняцці рашэнняў, і ў тым ліку ад яе голасу будзе залежаць лёс гэтага ўнікальнага кантынента.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

# ДАПАМОГА ПА ПРЫЗВАННІ

## Што робіцца дзеля змяншэння колькасці пажараў і калі варта чакаць паляпшэння сітуацыі?

Ёсць людзі, для якіх знаходзіцца побач у складаную хвіліну, — не проста прафесія, а справа гонару. Калі здараецца бяда, яны першымі прыходзяць на дапамогу. Без страху ўваходзяць у ахопленае полымем памяшканне, максімальна асцярожна выцягваюць з пашкоджаных аўтамабіляў пацярпелых у ДТЗ, працягваюць руку дапамогі тым, хто праваліўся пад лёд або заблукаў у лесе... Рызыкуюць сабой, каб захаваць жыццё іншаму. Невыпадкова першы званок у крытычнай сітуацыі менавіта ім — ратавальнікам.



Аляксандр КУДРАШОЎ з юнымі пажарнымі-добраахвотнікамі.

На працягу ста гадоў побач з гэтымі адважнымі людзьмі знаходзяцца іх не менш мужныя калегі — члены Беларускага добраахвотнага пажарнага таварыства. У шэрагах аднаго з найстарэйшых грамадскіх аб'яднанняў краіны — каля 14 тысяч грамадзян, якія актыўна ўзаемадзейнічаюць з супрацоўнікамі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях у рамках правядзення пажарна-прафілактычнай работы, дапамагаюць найбольш уразлівым катэгорыям насельніцтва ва ўстановах аўтаномных пажарных апавяшчальнікаў, рамонце электраправодкі і пячнога ацяплення. Што яшчэ звязвае добраахвотнікаў з ратавальнікамі, у чым прычына большасці пажараў і што варта зрабіць кожнаму, каб папярэдзіць трагедыю, расказаў **старшыня Беларускага добраахвотнага пажарнага таварыства Аляксандр КУДРАШОЎ**.

***— Аляксандр Мікалаевіч, відавочна, што створанае сто гадоў таму таварыства было рэакцыяй на выклікі часу...***

— Пажары заўсёды прыносілі вялікую бяду. Людзі збягаліся і талакой спраўляліся з агнём. У гарадах былі створаны прафесійныя пажарныя каманды. Яны былі малакалькасныя, таму не маглі справіцца са стыхійнымі пажарамі. Невыпадкова ў грамадзян з'явілася жаданне стварыць добраахвотныя таварыствы. Першае на тэрыторыі Беларусі з'явілася ў 1872 годзе ў Віцебску. У 1876 годзе падобнае аб'яднанне ўзнікла ў Мінску. Пачалі пераймаць гэты вопыт іншыя гарады. Дзеля кансалідацыі сіл 12 снежня 1924 года створана Усебеларускае пажарнае таварыства, куды таксама ўваходзілі добраахвотныя пажарныя дружыны, якія працавалі на прадпрыемствах. Новая гісторыя аб'яднання пачалася пасля Вялікай Айчыннай вайны. У 1956 годзе было прынята рашэнне аб уз'яднанні добраахвотнага пажарнага таварыства. З таго часу мы планамерна развіваемся.

***— Якія задачы ўскладзены на цяперашніх пажарных-добраахвотнікаў?***

— У 2006 годзе таварыства атрымала статус дзяржаўнага рэспубліканскага грамадскага аб'яднання, а ў 2019 годзе ўказам Прэзідэнта былі прыняты новы статут, які вызначаны дзяржаўна значныя задачы. Сярод іх — аказанне дапамогі прафесіяналам у ліквідацыі і прафілактыцы пажараў, садзейнічанне ў пытаннях барацьбы з пажарамі, навучанне насельніцтва правілам пажарнай бяспекі. Акрамя таго, займаемся вытворчай дзейнасцю. У краіне сканцэнтравана 10 нашых прадпрыемстваў, на якіх, у прыватнасці, выраблякм вогнетушыцелі (каля 50 тысяч за год). Таксама аказваем паслугі насельніцтву ў правядзенні праверак газа-вентыляцыйных каналаў, абслугоўваем сістэмы аўтаматычнай пажарнай сігналізацыі, аўтаматычнага пажаратушэння і інш. Падчас правядзення капітальнага рамонту дамоў вырашаем пытанні па вогнеахове, маланкаахове, электрабяспецы і г. д.

***— Што датычыцца тушэння пажараў, няўжо нашы ратавальнікі не спраўляюцца?***

— Ліквідацыяй узгаранняў поўнасцю займаюцца ратавальнікі. Мы не перашкаджаем нашым прафесіяналам. Свой унёсак найперш робім у прафілактычную работу. Прымаем удзел ва ўсіх акцыях ведамства: як у дзіцячых садках, школах, так і ў працоўных калектывах. Праводзім каля трох тысяч акцый у год, за гэты час правілам пажарнай бяспекі навучаем каля 9 тысяч чалавек. Акрамя таго, створаны добраахвотныя пажарныя прафілактычныя фарміраванні — каля 100 па ўсёй краіне. Прафілактычнай работай займаецца каля тысячы чалавек: распаўсюджваюць наглядна-выяўленчую прадукцыю, ажыццяўляюць рэйды па жылым сектары, даюць рэкамендацыі, указваюць на недахопы, аб якіх пры неабходнасці інфармуюць МНС. Што датычыцца тушэння пажараў, мы выступілі з ініцыятывай стварэння добраахвотных пажарных фарміраванняў са шматлікімі відамі тэхнікі. Такіх у нас пакуль па адной у кожнай вобласці. У асноўным яны прыцягваюцца для тушэння прыродных пажараў або для аказання дапамогі ў ліквідацыі пэўнай надзвычайнай сітуацыі.

***— Хто ўваходзіць у добраахвотныя пажарныя фарміраванні?***

— У нашых шэрагах шмат дзеючых супрацоўнікаў МНС, педагогі, сацыяльныя работнікі, члены выканкамаў — тыя, хто працуе з людзьмі. Створана 590 першасных арганізацый. Членам нашага аб'яднання пры жаданні можа быць любы грамадзянін. Аднак ёсць узроставы цэнз: да 16 гадоў — толькі з дазволу бацькоў. У Дзятлаве Гродзенскай вобласці, напрыклад, стварылі маладзёжную каманду. Гэта школьнікі. Мы іх навучылі, абмундзіравалі, яны добра спраўляюцца з ускладзенымі на іх абавязкамі.

***— Нягледзячы на тое, што на календары — зіма, у ратавальнікаў гарачая ў прамым сэнсе пара. Практычна штодзень, а то і па некалькі разоў за суткі яны выязджаюць на ліквідацыю пажараў. Не абыходзіцца без ахвяр. Як такое магчыма ў XXI стагоддзі, калі праводзіцца шырокая прафілактычная работа, працуюць сістэмы апавяшчэння?***

— Я ў гэтай прафесіі з 1972 года. У свой час служыў ва ўпраўленні пажарнай аховы МУС Рэспублікі Беларусь, і тады гібель людзей на пажарах была ў некалькі разоў большая. На працягу апошніх гадоў сумная статыстыка зніжаецца. Аднак ёсць людзі, якія не паддаюцца прафілактычнай рабоце. Перш за ўсё тыя, хто злоўжывае алкаголем. Тэхнічных прычын гібелі людзей на пажарах абсалютна няшмат. У асноўным пажары здараюцца ў сельскай мясцовасці, дзе размяшчаюцца будынкі пятай ступені вогнеўстойлівасці (гэта драўляныя хаты) з пячным ацяпленнем. Здараюцца пажары і з-за яго няправільнай эксплуатацыі. Электраабсталяванне — таксама невялікі працэнт. У асноўным узгаранні адбываюцца з-за неасцярожнага абыходжання з агнём пры курэнні, у тым ліку ў нецвярозым стане.

***— Што рабіць, каб сітуацыя палепшылася?***

— Вельмі вялікую работу мы праводзім з дзецьмі. Такое ўзаемадзеянне пачалося гадоў 20 таму. Ёсць надзея, што, калі гэтае пакаленне вырасце, усе будуць навучаны правілам пажарнай бяспекі.

***— Ці ахвотна людзі ўстанаўліваюць аўтаномныя пажарныя апавяшчальнікі?***

— Мы праводзім вельмі сур'ёзную агітацыйную работу. Усе нованбудоўлі сёння забяспечваюцца аўтаномнымі пажарнымі апавяшчальнікамі. Акрамя таго, толькі мы ўстанаўліваем насельніцтву каля 10 тысяч аўтаномных пажарных апавяшчальнікаў за год. Людзі разумеюць важнасць гэтага прыстасавання. Мы ўстанаўліваем і сістэмы з гукавым апавяшчэннем, у тым ліку разлічаныя на людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Усё — дзеля захавання жыццяў.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота дадзена БДПТ.**


Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

**Извещение о проведении повторных электронных торгов**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 |
| **Продавец** | СТОАО «Світанак», Гродненская обл., г. Слоним, ул. Красноармейская, д. 4. УНП 500041006 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638 – **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов**

**Лот № 1**

**31/50 доли в праве собственности на здание нежилое** (инв. № 450/С-2946, 6158,8 кв. м, составные части: подвал, бордюры, покрытия, благоустройство, газон). Адрес: **Гродненская обл., Слонимский р-н, г. Слоним, ул. Коссовский Тракт, 100.** В состав лота входят **канализационные сети** (инв. № 450/С-31477, 82,6 м). ***Сведения о земельных участках***: пл. **0,8074 га,** предоставлен на праве постоянного пользования; три участка предоставлены на праве аренды (срок действия: по 11.05.2072) пл. **0,0001 га, 0,0001 га, 0,0016 га. Обременения: площади здания, принадлежащие продавцу, частично сданы в аренду.** Подробная информация у организатора торгов и на сайте cpo.by.

**Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 3 818 184,00 бел. руб.**

**Лот № 2**

**Здание** (здание специализир. коммун. хозяйства, инв. № 450/С-24780, общ. пл. 414,8 кв. м, составные части и принадлежности: две пристройки); **канализационные сети** (сооружение специализир. коммун. хозяйства, инв. № 450/С-24783, составные части и принадлежности: канализац. колодец); **тепловая сеть** (сооружение специализир. коммун. хозяйства, инв. № 450/С-24781). **Обременение: договор аренды.** Адрес: **Гродненская обл., Слонимский р-н, г. Слоним, ул. Брестская, д. 67, корп. 1.** ***Сведения о земельном участке***: пл. **0,0587 га** предоставлен продавцу на праве аренды (срок действия по 20.09.2071) для строительства и размещения объектов коммунального хозяйства. В состав лота входит иное имущество: линия электросетей м-на Интерьер.

**Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 120 622,80 бел. руб.**

**Лот № 3**

**Склад (баня)** (здание многофункциональное, инв. № 450/С-18993, общ. пл. 318 кв. м, составные части и принадлежности: уборная, три пристройки, ворота, забор). Адрес: **Гродненская обл., Слонимский р-н, г. Слоним, ул. Хлюпина, д. 14.** ***Сведения о земельном участке***: пл. **0,1445 га**, предоставлен продавцу на праве аренды (срок действия: по 01.11.2041) для строительства и обслуживания здания склада (бани).

**Начальная цена лота № 3 с НДС 20 % – 25 920,00 бел. руб.**

**Лот № 4**

**Столовая** (здание специализированное для общественного питания, инв. № 450/С-18925, общ.пл. 672,7 кв. м, составные части и принадлежности: подвал, две пристройки, электроснабжение (1), канализационная сеть (Д), водопроводная сеть (Е), канализационный колодец (д1), водопроводный колодец (е1), покрытие (Ж, И, К), плиточное покрытие (Л), бордюр тротуарный (Л1), ограждение (М, Н), калитка (Н1)). Адрес: **Гродненская обл., Слонимский р-н, г. Слоним, ул. Красноармейская, д. 283, корп. 1.** ***Сведения о земельном участке***: пл. **0,1316 га** предоставлен продавцу на праве аренды (срок действия: по 20.09.2071) для строительства и обслуживания здания столовой.

**Начальная цена лота № 4 с НДС 20 % – 331 716,00 бел. руб.**

**Лот № 5**

**Административное здание (совместно с гаражом и котельной)** (здание многофункциональное, инв. № 450/С-29152, общ. пл. 547,3 кв. м, составные части и принадлежности: пристройка, дымовая труба), **склад № 2** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, инв. № 450/С-29155, общ. пл. 568 кв. м, составные части и принадлежности: пристройка (2Б/кз), пристройка (1)); **трансформаторная подстанция** (сооружение специализированное энергетики, инв. № 450/С-29156, общ. пл. 40,1 кв. м); **здание проходной** (здание специализированное иного назначения, инв. № 450/С-29153, общ. пл. 31.6 кв. м); **благоустройство территории** (сооружение неустановленного назначения, инв. № 450/С-31422, общ. пл. 1076,1 кв. м, Составные части и принадлежности: А Благоустройство территории, а.1 Покрытие, а1.1Бордюр, а2 Ограждение, а2.1 Ворота, а3 Эстакада, а3.1 Ограждение). Адрес: **Гродненская обл., Слонимский р-н, г. Слоним, ул. Минский Тракт, д. 4 корп.1-3, д. 4, 4/4.** ***Сведения о земельном участке***: пл. **0,6679 га** предоставлен продавцу на праве аренды (срок действия: по 30.07.2068) для размещения объектов оптовой торговли, материально-технич. и продовольствен. снабжения, заготовок и сбыта продукции. В состав лота входит иное имущество: котел отопительный твердотопливный КОТВ-95; насос К45/30с дв. 7,5/3000.

**Начальная цена лота № 5 с НДС 20 % – 430 080,00 бел. руб.**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BYN BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки».

**Срок подписания договора купли-продажи: 30 (тридцать) рабочих дней** после проведения аукциона.

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати)** календарных дней после заключения договора купли-продажи.

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов, установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов, либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору торгов в размере по лоту № 1 – **2%**, по лотам № 2, 4, 5 – **4 %,** по лоту № 3 – **6 %** от цены продажи в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона.

Предыдущее извещение опубликовано в г. «Звязда» 24.12.2024 (лот № 1), 27.11.2024 (лоты № 2–5)

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 11.02.2025 с 11.00 до 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов.

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 10.02.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35. Email: auction@cpo.by**

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

**Извещение о проведении повторных электронных торгов в форме открытого аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191 021 390, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. |
| **Продавец** | ОАО «БААЗ», г. Барановичи, ул. Гагарина,62, УНП 200167349 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191 224 638, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1 (www.ipmtorgi.by) |

**Предмет электронных торгов:**
Местонахождение: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Гагарина, 62

| Лот № | Наименование | Начальная цена (с НДС), бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | **Трактор МТЗ-82**, 1989 г. в., инв.№ 7630 | **9 035,93** |
| 2 | **Трактор** МТЗ-80, 1989 г. в., инв.№ 7642 | **7 590,18** |
| 3 | **Грузовой бортовой MAZ 5340 A5-370-015**, **АН 2005-1**, 2012 г. в. | **35 782,26** |
| 4 | **Автобус вагон (WAGON) GAZ-2217, АЕ 0039-1**, 2009 г. в. | **11 565,98** |

Начальная цена снижена на 5 %.
Шаг аукциона: 5 % от текущей цены

Задаток **10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на на р/с BYN BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» (г. Минск), БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа — ЗАО «Центр промышленной оценки».

**Срок заключения договора купли-продажи: 15 рабочих дней** после проведения аукциона.

**Условия оплаты предмета аукциона**

Победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее **30 (тридцати) дней** со дня проведения торгов.

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. Победителем аукциона признаётся участник, предложивший максимальную цену.

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов **затраты** на их проведение и оплатить **вознаграждение 10 %** от цены продажи лота в течение **3 рабочих дней** после проведения электронных торгов.

Предыдущее извещение опубликовано в г. «Звязда» от 18.12.2024

**Дата и время начала и окончания электронных торгов**: **13.02.2025 с 11.00 до 12.00**. Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов.

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 12.02.2025 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by.

| | |
|---|---|
| **Контактные данные:** | +375 17-310-36-37; +375 (29) 154 34 35; Email: auction@cpo.by. |



ИНДУСТРИЯ ИННОВАЦИЙ
юридическая компания

• Взыскание задолженности
• Проведение торгов
• Ликвидация
• Юридические услуги

**Извещение о проведении повторных публичных электронных торгов (аукциона)**

| | |
|---|---|
| **Организатор публичных торгов (аукциона)** | ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н. Сайты в интернете: www.iin.by, https://iintorgi.by |
| **Продавец** | ОАО «Банк БелВЭБ», 220004, г. Минск, пр-т Победителей, 29. |

**Ранее опубликованное извещение о проведении публичных электронных торгов (аукциона) в г. «Звязда» от 15.10.2024 № 201 (30335), стр. 10.**

**Предмет публичных торгов (аукциона)**

| Лот № | Наименование | Начальная цена, бел. руб. с учетом НДС | Минимальная цена, бел. руб. с учетом НДС |
|---|---|---|---|
| 1 | Несамоходное судно баржа-площадка Р-0444, проекта 775, 1984 г. в. | 52 233,13 | 41 786,50 |

**Задаток 5 %** от начальной цены предмета публичных торгов (аукциона) в белорусских рублях перечисляется на р/с BY48OLMP3012300094564 0000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411, получатель платежа – **ООО «Индустрия Инноваций».**

**Шаг электронных торгов** – 5 % от начальной и (или) складывающейся в ходе торгов цены лота.
В случае отсутствия ставок участников торгов начальная цена торгов поэтапно снижается равными долями 5 (пять) раз до минимальной цены или до момента совершения ставок участниками торгов.

**Информация об имуществе**, условия участия и порядок проведения публичных торгов (аукциона) размещены в открытом доступе на официальном сайте электронной торговой площадки «Индустрия Инноваций – Торги» https://iintorgi.by.

**Срок подписания договора купли-продажи: не позднее 10 (десяти) рабочих дней** после публичных торгов (аукциона).

**Условия оплаты предмета электронных торгов: не позднее 10 (десяти) рабочих дней** со дня заключения договора купли-продажи. Переход права собственности – после полной оплаты Имущества.

**Торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «Индустрия Инноваций - Торги», размещенном по адресу:** https://iintorgi.by.

Победитель публичных торгов (аукциона), либо единственный участник публичных торгов (аукциона), согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить аукционисту торгов вознаграждение в размере **1 % от цены продажи лота, но не менее 200,00 бел. руб. в течение 3 (трех) рабочих дней** после проведения публичных торгов (аукциона).

Организатор публичных торгов (аукциона) имеет право снять предмет аукциона с торгов, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты проведения торгов (аукциона).

**Дата и время проведения торгов (аукциона):** 10.02.2025 начало торгов 10.00, окончание торгов 16.00, электронные торги продлеваются на 3 минуты с момента поступления последней ставки, если ставка сделана менее чем за 3 минуты до времени окончания торгов. Заявки на участие в публичных торгах (аукционе) принимаются по 07.02.2025 г. до 16.00.

| | |
|---|---|
| **Контактные телефоны:** | **тел: +375 17-300-90-03; +375 (29) 671-83-95; e-mail: e.pinchuk@iin.by.** |



**Брестский филиал РУП "Институт недвижимости и оценки"**

Извещает о внесении изменений в извещение о продаже имущества ОАО "Рогознянский", опубликованого в газете "Звязда" от 23.01.2025.

Аукцион состоится **26 февраля 2025 г. в 11.00**

Телефон для справок 8 (0162) 40-87-01

УНП 201028245


СКАЖЫЦЕ, ДОКТАР...

# ВІРУС У КРАПІНКУ

## Ці такая бясшкодная вятранка, як можа здавацца?

Вятранка, мусіць, самае частае інфекцыйнае захворванне. Адпаведна, нашы бабулі, мамы, ды і мы самі ведаем пра яго ўсё. Або не? Напрыклад, ці ведаеце вы, што агульнага паміж вятранкай і апаясвальным герпесам? Развенчвае міфы і адказвае на самыя распаўсюджаныя пытанні пра гэта захворванне ўрач-інфекцыяніст 22-й гарадской дзіцячай паліклінікі Дар'я ПЕТРАЧУК.

### ВІНАВАТЫ VARICELLA ZOSTER VIRUS

***— Калі ў сям'і дарослы хварэе на апаясвальны герпес, ці заразны ён для дзіцяці?***

— Апаясвальны герпес (herpeszoster, або апаясвальны лішай) — вострае віруснае захворванне чалавека з пераважным пашкоджаннем скуры і нервовай сістэмы. Прычынай яго ўзнікнення з'яўляецца вірус Varicella Zoster. Гэтую назву ён атрымаў у сувязі з тым, што можа выклікаць два розныя па клініцы захворванні: ветраную воспу і ўласна апаясвальны герпес. Заражэнне звычайна адбываецца ў дзіцячым узросце, суправаджаючыся ў 95 % выпадкаў развіццём ветраной воспы, ці працякае бессімптомна.



Пасля перанесенай ветраной воспы вірус пажыццёва захоўваецца ў арганізме ў нервовых гангліях і пры пэўных умовах (пераахаладжэнне, зніжэнне імунітэту, недастатковае харчаванне, гіперінсаляцыя, стрэс, траўма, хімія- ці цытастатычная тэрапія) можа праявіцца ў выглядзе апаясвальнага лішая. Таму, калі дзіця не хварэла на ветраную воспу, дарослы для яго заразны. Прычым заразны ўвесь перыяд высыпанняў да адпадзення скурачак. Дарэчы, гэта захворванне перадаецца паветрана-кропельным шляхам і адрозніваецца здольнасцю распаўсюджвацца на вялікія адлегласці — з паверха на паверх, у суседнія пакоі, калідоры.

***— Дзіця ад вятранкі лепш прышчапіць?***

— Гэта адназначна. Вятранка можа мець шэраг ускладненняў. Часцей за ўсё — гнойныя з боку скуры і мяккіх тканак. Актуальная вакцынацыя ў першыя 72 гадзіны пасля кантакту з хворым. Цяпер у наяўнасці дзве вакцыны ад ветраной воспы розных вытворцаў. Зрабіць прышчэпку можна на платнай аснове.

***— Калі адно дзіця хварэе на ветраную воспу, ці трэба ізаляваць другое дзіця і калі ў яго чакаць высыпкі?***

— У першыя 72 гадзіны можна прышчапіць кантактнае дзіця, і рызыка захварэць знізіцца ў шмат разоў. Кантактны ізалюецца з 11-га па 21-ы дзень. Калі, напрыклад, сып пачаўся першага чысла, то з 11-га па 21-ы дзень кантактнае дзіця адпраўляецца на каранцін. У гэты перыяд павінны з'явіцца прыкметы захворвання, звычайна гэта 14-ы дзень.

***— Калі чалавек пачынае быць заразным пры ветраной воспе?***

— За два дні да высыпанняў. Плюс увесь перыяд высыпанняў і пяць дзён пасля апошніх высыпанняў.

***— Ці можна хварэць на вятранку двойчы?***

— Можна. Часцей гэта здараецца ў людзей невакцынаваных. Тут прасочваецца спадчыннасць: калі ў сям'і ўжо былі паўторныя выпадкі, шанцы павялічваюцца.

### ЦІ ВЫЗНАЧАЦЬ АНТЫЦЕЛЫ?

***— Калі дзіця вакцынаванае, ці ёсць сэнс у вызначэнні ўзроўню IgG?***

— Не, дастаткова дакументальнага пацвярджэння ўвядзення дзвюх доз вакцыны.

***— Ці варта дыягнаставаць вятранку, вызначаючы IgM?***

— Сералагічны тэст, які вызначае ўзровень імунаглабулінаў, мае абмежаваную дыягнастычную каштоўнасць пры ветраной воспе і не рэкамендуецца для лабараторнага пацвярджэння вострага захворвання. Тэст мае нізкую спецыфічнасць і часта можа ўзнікнуць ілжывастаноўчы вынік. Толькі пры станоўчым імунаглабуліне M і клініцы ветраной воспы можна казаць аб вострай інфекцыі. Проста станоўчы імунаглабуліны M і адсутнасць клінічнай праяў не дазваляюць нам дыягнаставаць захворванне. Плюс антыцелы будуць выяўляцца са значнай затрымкай пасля з'яўлення сыпу, і ў здачы гэтага аналізу я не бачу ніякага сэнсу. Звычайна для выстаўлення дыягназу дастаткова клінічных праяў і эпідэміялагічнага анамнезу.

***— Ці абавязкова змазваць сып зялёнкай?***

— Пры апрацоўцы значна зніжаецца сверб, сам элемент падсушваецца, зніжаецца рызыка далучэння бактэрыяльнай флоры. Можна скарыстацца і ласьёнамі з утрыманнем цынку і спіртазмяшчальнымі растворамі анілінавых фарбавальнікаў. Апошнія, праўда, у наш час прымяняюцца абмежавана, што абумоўлена ростам рэзістэнтнасці шэрагу мікраарганізмаў да іх дзеяння і неэстэтычнасцю прымянення: сляды раствораў доўга захоўваюцца на скуры і падфарбоўваюць адзенне.

***— Ці дапамагаюць супрацьвірусныя прэпараты пры ветраной воспе?***

— Толькі пасля рэкамендацый урача можна выкарыстоўваць ацыклавір, валацыклавір, фамцыклавір. Гэтыя прэпараты не заўсёды патрэбныя пры ветраной воспе і пры прызначэнні ўрач узважвае рызыку і карысць. Звычайна гэта цяжкія формы ветраной воспы, развіццё неўралагічных ускладненняў, паражэнне ўнутраных органаў. Іншыя прэпараты не маюць даказанай эфектыўнасці.

### У ДУШ — АБАВЯЗКОВА

***— Ці можна прымаць душ або ванну пры ветраной воспе?***

— Так. Пажадана штодня і лёгкі, без мачалкі, пасля купання нельга выціраць цела, а толькі акуратна прамакаць. Ванна не рэкамендуецца, бо ў вадзе скурачкі размакаюць, што можа стаць пагрозай дадатковай інфекцыі.

***— Ці існуе вакцынацыя ад апаясвальнага лішая?***

— Так, але ў нас у краіне вакцына пакуль не зарэгістраваная. Вакцына ад ветраной воспы прадухіляе першаснае заражэнне вірусам Varicella Zoster (VZV), вакцыны ад апаясвальнага лішая прадухіляюць рэактывацыю віруса ва ўжо заражаных. Таму вакцыны ад ветраной воспы выкарыстоўваюць галоўным чынам у дзяцей, а вакцыны ад апаясвальнага лішая — у асоб, якія былі інфікаваныя VZV раней і ў якіх згасае напружанасць імунітэту. Гэта адбываецца з узростам і пры шэрагу імунадэфіцытных станаў.

***— Якой схемы вакцынацыі лепш прытрымлівацца?***

— Яна ўключае ўвядзенне дзвюх доз вакцыны. Пры руціннай вакцынацыі першую дозу ўводзяць дзецям у 12-15 месяцаў, другую — у 4-6 гадоў (звычайна спалучаючы з руцінным увядзеннем вакцыны ад адру, паратыту, краснухі). Старэйшым дзецям і неімунным дарослым ўводзяць дзве дозы з інтэрвалам 4-8 тыдняў.

**Алена КРАВЕЦ.**

# ЗАХАВАЦЬ «ЗАЛАТУЮ ГАДЗІНУ»

## Медыкам з глыбінкі дапаможа гэта зрабіць высокаэфектыўнае абсталяванне

**На ўзбраенні медыкаў Лельчыцкай цэнтральнай раённай бальніцы — новы кабінет камп'ютарнай тамаграфіі і абноўлены рэнтген-кабінет.**



Лельчыцкі раён — самы працяглы па тэрыторыі на Гомельшчыне і адзін з самых буйных у краіне. Аддаленасць сельскіх населеных пунктаў ад райцэнтра і Мазыра, як найбліжэйшага міжраённага пункта меддапамогі, а таксама абласнога цэнтра, выклікала складанасці пры транспарціроўцы экстранных пацыентаў. Цяпер кабінет камп'ютарнай тамаграфіі і абноўлены рэнтген-кабінет дазволяць лельчыцкім медыкам аператыўна дыягнаставаць паталогіі як касцявой тканіны, так і мяккіх тканін.

— Зусім нядаўна каля 600 пацыентаў з Лельчыц для пацвярджэння дыягназаў накіроўвалі ў Мазыр і Гомель. Сёння ўсе будуць прымацца ў райцэнтры, — на ўрачыстай цырымоніі адкрыцця кабінетаў высокаэфектыўнай дыягностыкі адзначыў **старшыня Гомельскага аблвыканкама Іван КРУПКО.** — Мяркую, што і замацаванне маладых спецыялістаў з такім абсталяваннем у вас будзе высокім.

З такімі словамі старшыня Гомельскага аблвыканкама звярнуўся да калектыву Лельчыцкай ЦРБ і нагадаў, што за апошнія тры гады ў райбальніцу прыбылі 40 медыцынскіх работнікаў сярэдняга звяна і сем урачоў.

Як падкрэсліў кіраўнік рэгіёна, за апошні месяц Гомельшчына зрабіла сур'ёзны крок у мадэрнізацыі галіны аховы здароўя. У цэлым сёння на ўзбраенні медыкаў вобласці — шэсць МРТ, столькі ж ангіёграфаў і 26 камп'ютарных тамографаў.

— У найбліжэйшы год запланавана ўстаноўка апарата МРТ у Жлобінскай і Рэчыцкай ЦРБ, камп'ютарнага тамографа ў Гомельскай гарадской бальніцы № 4. У анкадыспансер чакаем дарагі лінейны паскаральнік, які падчас сеанса апраменьвання падладжваецца з дакладнасцю да міліметра пад анатамічныя параметры пацыента. Новыя лічбавыя рэнтген-апараты на працягу двух гадоў з'явяцца ў 12 установах аховы здароўя вобласці, дзве трэці з якіх — раённыя, — пра бліжэйшыя планы развіцця аховы здароўя вобласці Іван Крупко расказаў падчас адкрыцця чарговых асабліва значных для рэгіёна аб'ектаў.

У Гомельскім абласным клінічным кардыялагічным цэнтры з удзелам губернатара адкрыліся кабінет з магнітна-рэзанансным тамографам і рэнтген-аперацыйная з ангіяграфічным комплексам. Так, у рэгіёне з'явіўся першы спецыялізаваны кабінет МРТ з пакетам кардыялагічных праграм і залатым стандартам магнітна-рэзанансная дыягностыкі.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА,**
**фота аўтара.**

### ИЗМЕНЕНИЯ (ДОПОЛНЕНИЯ) К ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ

опубликованной 10.01.2025 г. в издании газеты «Минский курьер» в ред. 2 (3987) по объекту строительства «Многоквартирный жилой дом в границах ул. Восточная, пер. 2-й Топографический, ул. Топографическая в г. Минске»

**Информация о застройщике**

**Застройщик:** государственное предприятие «УКС Советского района г. Минска» (далее – предприятие) зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей 17.12.2014 г. № 190576654.
**Юридический адрес и местонахождение предприятия:** 220005, г. Минск, пр. Независимости, 46 а, каб.1-8. тел/факс + 375 17 263-79-77.
**Отдел реализации:** 220005, г. Минск, пр. Независимости, 46, каб. 2, тел. +375(17)263-84-36, тел. +375(29)658-00-21, тел. +375(33)392-00-21.
**Режим работы предприятия:** понедельник – четверг, с 8.30 до 17.15, пятница, с 8.30 до 16.00, обеденный перерыв: с 12.30 до 13.00.

1. Информацию о порядке оплаты принять в новой редакции с даты опубликования настоящих изменений (дополнений) к проектной декларации:
«Для внесения денежных средств предусмотрена рассрочка платежа до ноября 2025 года (включительно). Первоначальный взнос в размере 20 % от общей стоимости объекта долевого строительства должен быть внесен в течение 10 банковских дней со дня регистрации договора в местном исполнительном и распорядительном органе, оставшаяся сумма денежных средств вносится в соответствии с графиком платежей к договору.».
2. Остальные условия проектной декларации остаются в прежней редакции.
Подробные сведения об объекте строительства, планировке и ходе строительства можно получить в отделе реализации по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 46, каб. 2, тел.: +375 17 263-84-36, +375 29 658-00-21, +375 33 392-00-21 либо на сайте предприятия ukssov.by (раздел «Долевое строительство»).

Уважаемые акционеры
ОАО «МИНСКИЙ ДОМОСТРОИТЕЛЬНЫЙ КОМБИНАТ»!

**19 февраля 2025 года в 15:00**
**состоится внеочередное общее собрание акционеров**
**ОАО «МИНСКИЙ ДОМОСТРОИТЕЛЬНЫЙ КОМБИНАТ»**
по адресу: г.Минск, ул. Пономаренко, 43 (актовый зал).

Повестка дня внеочередного общего собрания акционеров:

1. О досрочном прекращении полномочий членов ревизионной комиссии ОАО «МИНСКИЙ ДОМОСТРОИТЕЛЬНЫЙ КОМБИНАТ».
2. Об избрании членов ревизионной комиссии ОАО «МИНСКИЙ ДОМОСТРОИТЕЛЬНЫЙ КОМБИНАТ».

Реестр акционеров для участия в собрании акционеров будет сформирован по состоянию на 6 февраля 2025 г.

С материалами по вопросам повестки для собрания, лица, имеющие право на участие во внеочередном общем собрании акционеров, могут ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 43 в следующем порядке:

- с 12.02.2025 г. по 18.02.2025 г. в рабочие дни – с 9.00 до 16.40, с перерывом с 12:00 до 12:30, по адресу: г.Минск, ул.Пономаренко, 43, каб. 304А, в день проведения собрания – 19.02.2025 г. – с 9.00 до 14.30 по месту его проведения.

Регистрация участников собрания будет осуществляться **19 февраля 2025 г. с 14.15 до 14.45** по месту проведения собрания.

Для регистрации при себе иметь акционеру Общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

Наблюдательный совет
ОАО «Минский домостроительный комбинат»
УНП 100258980

### РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона)

**извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ООО «АСБ Лизинг» (Продавец).**

Аукцион состоится **14.02.2025 г. в 11.00**
по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4.

**Лот № 1:** Платная автостоянка №4 с инв. № 600/С-140105, 15 460 кв. м Адрес: Республика Беларусь, Минская обл., Минский р-н, Щомыслицкий с/с, район аг. Озерцо. Обременения – аренда. Земельный участок площадью 1,9656 га с кадастровым номером 623688000001000886. Право аренды, срок действия: с 23.06.2016 г. по 23.06.2046 г. Начальная цена с НДС 20 % – 1 610 000,00 руб. Задаток – 50 000,00 руб.

**Лот № 2:** 1. Здание складов, торговых баз с инв. № 500/С-23896, 1122,2 кв. $м^2$. Здание специализированное розничной торговли с инв. № 500/С-22663, 464,8 кв. $м^3$. Здание специализированное розничной торговли с инв. № 500/С-22666, 482,6 кв. $м^4$. Здание специализированное розничной торговли с инв. № 500/С-22966, 554,5 кв. м. Адрес: г. Минск, ул. Уручская, 19Б/12, 19Б, 19Б/2, 19Б/3. Обременения – аренда. Земельный участок площадью 7.7327 га с кадастровым номером 500000000009009107. Право аренды, доля: 57/625. На земельном участке расположены иные объекты недвижимости, которые не выставлены на аукцион.

Начальная цена с НДС 20 % – 1 530 000,00 руб. Задаток – 50 000,00 руб. Шаг аукциона – 5 %. Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – gostorg.by. Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель - РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений и задатка – 12.02.2025 г. в 11.00.

**Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52; gostorg.by**
**e-mail: torgi@ino.by**

Центр Промышленной Оценки

- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

### Извещение о проведении повторных электронных торгов в форме открытого аукциона

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. |
| **Продавец** | ОАО «Управление механизации №91», г. Минск, ул. Бабушкина, 17, пом. 3 |
| **Оператор /Адрес ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов:** **Полуприцеп платформа MAZ 5247 d**, № кузова 9011, р/з 6793 АА-7, 1990 г. в., инв. № 60061, по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, д. 17 (производственная территория).
**Начальная цена лота с НДС 20 % – 28 956,00 бел. руб.**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки».

**Срок подписания договора купли-продажи: 5 (пять)** календарных дней со дня завершения электронных торгов.

**Условия оплаты предмета электронных торгов: 10 (десять)** рабочих дней с даты заключения договора купли-продажи. Расходы за снятие с учета/регистрации несутся покупателем.

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившиеся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязаны возместить затраты продавцу за проведение независимой оценки и затраты организатору торгов на их проведение, также оплатить организатору торгов установленное вознаграждение **7 %** от цены продажи лота в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее, чем за один день до наступления даты проведения аукциона.

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в г. «Звязда» от 10.12.2024 г.

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 12.02.2025 г. с 11.00 до 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов.

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются: по 11.02.2025 г. до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги», по адресу: www.ipmtorgi.by.**

**Контактные телефоны: +375 (17) 310-36-37; +375 (29) 154-34-35; Email: auction@cpo.by**

Центр Промышленной Оценки

- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

### Извещение о проведении повторных электронных торгов в форме открытого аукциона

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «Белцветмет», Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, 42/2, район аг. Гатово. УНН 100088666 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1 (www.ipmtorgi.by) |

**Предмет электронных торгов**

**Бытовое помещение типа М-К2-2-15 В.1 (18 кв. м,** инв. №,2452, 2003 г. в.).
Местоположение: Могилевский р-н, аг. Полыковичи, ул. Подгорная, 1В.

**Начальная цена с НДС 20 % — 2 880,00 бел.руб.** (снижена на 20 %)
***Шаг аукциона: 5 % от текущей цены.***

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки».

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней со дня завершения электронных торгов.

**Условия оплаты предмета электронных торгов: 10 рабочих дней** с даты заключения договора купли-продажи.

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившиеся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязаны возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение 10 % от цены продажи в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов.

Предыдущее извещение опубликовано в г. «Звязда» от 24.12.2024 г.

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 12.00 14.02.2025 г.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов.

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 13.02.2025 г. до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги», по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 (17) 310-36-37; +375 (29) 154-34-35; auction@cpo.by**



Падрыхтоўка да юбілею вядзецца як на царкоўным, так і на дзяржаўным узроўні. 15 студзеня ў Полацку ўрачыста адкрылася пасля працяглай рэстаўрацыі Спаса-Праабражэнская царква — адзіны храм XII стагоддзя на тэрыторыі нашай краіны, у якім захаваліся ўнікальныя фрэскі.

# СПАСА-ЕФРАСІННЕЎСКІ МАНАСТЫР РЫХТУЕЦЦА ДА 900-ГОДДЗЯ

Як расказала манахіня Іўстына — супрацоўніца выдавецтва Спаса-Ефрасіннеўскага жаночага манастыра, сёння храм гатовы прымаць вернікаў і тых, хто хоча наведаць адну з галоўных святынь Беларусі. Адзіная ўмова: адначасова ў ім не павінна знаходзіцца больш за 15 чалавек: тут важна падтрымліваць асаблівыя тэмпературна-вільготнасныя ўмовы для захавання старажытных роспісаў.

Таксама завершана добраўпарадкаванне саборнай плошчы манастыра, вядзецца будаўніцтва трапезнай.

Сёння Спаса-Ефрасіннеўскі манастыр вядзе актыўную асветніцкую дзейнасць. Пры ім створаны дзве бібліятэкі: адна для сясцёр, другая — для прыхаджан. Маецца і ўласнае выдавецтва, у якім выходзяць буклеты, брашуры, паштоўкі і кнігі. У 2024 годзе быў падрыхтаваны вялікі даведнік па манастыры. На гэты год плануецца выданне яшчэ аднаго, больш кароткага, а таксама манаграфіі «Подзвіг любові і вернасці Богу» — кнігі аб гісторыі Полацкай святыні ў перыяд з Вялікай Айчыннай вайны да нашага часу.

У тым ліку будзе змешчана інфармацыя пра жыццё прыхадской абшчыны, калі манастыр апусцеў, і пра адраджэнне храма ў 1990-я гады. Плануецца да выдання юбілейны фотаальбом аб Спаса-Ефрасіннеўскім манастыры. У сувязі з вялікай цікавасцю ў вернікаў і турыстаў да дзіцячай літаратуры будзе перавыдадзена кніга «Адзін дзень у Полацкім манастыры». Гэта сумесны праект са Свята-Елісавецінскім манастыром. Запатрабаваны і выдадзены праект «Жыцце Прападобнай Ефрасінні вачамі дзяцей нядзельнай школы», у якім змешчаны сачыненні і ілюстрацыі юных творцаў.

У духоўна-асветніцкім цэнтры манастыра працуе нядзельная школа, якую наведваюць як дзеці, так і дарослыя. Таксама ёсць маладзёжнае аб'яднанне. Для юных вернікаў праводзяць урокі Закона Божага, царкоўнай гісторыі і іншых дысцыплін. Дзеці ўдзельнічаюць у падрыхтоўцы і правядзенні спектакляў, канцэртаў, малююць, ствараюць розныя вырабы, далучаюцца да творчых конкурсаў, у тым ліку і на рэспубліканскім узроўні.

Прадстаўнікі манастыра таксама вядуць асветніцкую работу ў адукацыйных і культурных установах: па запрашэнні выступаюць з дакладамі, лекцыямі, праводзяць духоўна-маральныя гутаркі з навучэнцамі.

Для паломнікаў сёстры штодзень праводзяць экскурсіі па манастыры. Тут працуе экскурсійнае бюро, якое прымае заяўкі і рэгіструе арганізаваныя групы. У 2023 і 2024 гадах колькасць такіх груп дасягала амаль дзвюх тысяч з агульнай колькасцю гасцей каля 45 тысяч чалавек. Летась, акрамя шматлікіх паломнікаў з Беларусі, манастыр у Полацку наведалі групы з Расіі, Казахстана, Прыбалтыкі, Германіі, Францыі, Іспаніі, Бельгіі, Чэхіі, Швецыі, Галандыі, Грузіі, Арменіі, Таджыкістана, Кыргызстана, Малдавіі, Ізраіля, ЗША.

Як паведаміла манахіня Іўстына, сёстры манастыра дапамагалі ў падрыхтоўцы фільмаў, прысвечаных святыні. Адна са стужак — «Прыстанак Святой Ефрасінні» — знятая «Беларусьфільмам», другая стужка — «Дзве Ефрасінні» — зроблена расійскай тэлекампаніяй «Спас».

Напярэдадні юбілею ўжо прайшлі два вялікія мерапрыемствы, арганізаваныя Праваслаўнай царквой: копія крыжа беларускай святой увосень мінулага года пабывала ва ўсіх епархіях Беларусі, каўчэг з мошчамі Прападобнай Ефрасінні — у епархіях Расіі.

# СТАНАЎЛЕННЕ ДЗЯРЖАВЫ СУПАЛА З ЧАСАМ ДУХОЎНАГА РАЗВІЦЦЯ

У Доме прэсы абмеркавалі ролю традыцыйных канфесій на сучасным этапе. У сустрэчы ўзялі ўдзел прадстаўнікі Беларускай Праваслаўнай Царквы і Рыма-Каталіцкага Касцёла. Больш за дзве трэці рэлігійных арганізацый, зарэгістраваных у нашай краіне, сёння належаць менавіта да гэтых канфесій. Усяго ж на 2024 год у Беларусі налічвалася 3419 рэлігійных абшчын.

Як заўважыў **Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Аляксандр РУМАК**, перыяд станаўлення незалежнай дзяржавы супаў з часам духоўнага развіцця і ўмацавання нашага народа. Толькі з 1989 да 1996 года амаль у два разы павялічылася колькасць рэлігійных абшчын. З ініцыятывай па аднаўленні і рэстаўрацыі храмаў актыўна выступалі самі грамадзяне.

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў, старшыня Экспертнага савета пры Упаўнаважаным па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Алег ДЗЯЧЭНКА** адзначыў, што ў апошнія гады зроблены вялікі крок па замацаванні хрысціянскіх каштоўнасцяў у нацыянальным заканадаўстве. У Канстытуцыі замацавана норма, якая фіксуе традыцыйнае хрысціянскае разуменне сям'і і шлюбу. У 2023 годзе сур'ёзная работа вялася па абнаўленні Закона «Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях». Над ім працавала рабочая група, у якую ўваходзілі прадстаўнікі вядучых хрысціянскіх канфесій, парламентарыі, апарат Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў. «Гэта важны дакумент, які рэгулюе прававыя адносіны ў канфесійнай сферы, стаіць на абароне інтарэсаў вернікаў», — сказаў Алег Дзячэнка. Таксама ён звярнуў увагу на тое, што захаванне міру і міжканфесійнай згоды з'яўляецца важным пунктам перадвыбарнай праграмы кіраўніка дзяржавы.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

## Извещение о проведении повторного аукциона по продаже не завершенного строительством незаконсервированного жилого дома и земельного участка в частную собственность в аг. Вязье Осиповичского района Могилевской области

| № лота | Наименование объекта /адрес участка | Кадастровый номер, вид вещного права | Общая площадь (га) | Целевое назначение использования участка | Начальная цена предмета аукциона (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Расходы по подготовке зем.-кадастр. документации, проведение оценки (руб.) | Описание незавершенного строительством жилого дома, дачи, его составных частей. Характеристика инженерных коммуникаций и сооружений на участке, в т.ч. ограничения и условия в его использовании | Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Не завершенный строительством незаконсервированный жилой дом и земельный участок площадью 0,1412 га по ул. Озерной,28 в аг. Вязье Осиповичского района | б/н земельный участок в частную собственность | 0,1412 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (код 1 09 02, земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме)) | 15 762,83 рублей, в том числе начальная цена не завершенного строительством незаконсервированного жилого дома – 12 218,71 руб., начальная цена продажи земельного участка в частную собственность – 3 544,12 руб. | 3 100,00 | 3 219,25 | Не завершенный строительством незаконсервированный жилой дом – фундамент бетонный, износ конструктивных элементов – 20 %, летняя кухня, беседка, сарай, уборная, теплица. Ограничения в использовании земельного участка: в охранной зоне электрической сети (код 5.2) 0,0045га; на природных территориях подлежащих специальной охране (в водоохранной зоне реки, водоема) (код 2.4) 0,1412га, на природных территориях, подлежащих специальной охране (в зоне санитарной охраны источников питьевого водоснабжения централизованных систем питьевого водоснабжения) (код 2.7) 0,1412га | Определяется проектной документацией |

| | |
|---|---|
| Размер штрафа, уплачиваемый в случаях, определенных Положением о порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденных постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23 марта 2018 г. № 220 и Указом Президента Республики Беларусь «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» от 05.05.2009 г. №232 | 4000,00 руб |
| Организатор аукционных торгов – УКПП «Архитектура», Могилевская обл., г.Осиповичи, ул. Сумченко, 33. Контактные телефоны +375(2235)66101, +375(29)3999800, +375(33)6075847 | Задаток перечисляется Вязьевскому сельскому исполнительному комитету на р/с № BY04AKBB36411165500077100000 в ОАО «АСБ «Беларусбанк» ЦБУ № 722 BIC AKBBBY2X, УНП 700023291, код 40901. Задаток перечисляется в период подачи заявлений до момента регистрации участника. |

**Условия проведения аукциона:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденных постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23 марта 2018 г. № 220, и состоится при наличии не менее двух участников. В аукционе могут участвовать граждане Республики Беларусь, негосударственные юридические лица Республики Беларусь, допускается участие в аукционе консолидированных участников.

**Перечень документов, представляемый участником аукциона до его начала**: заявление на участие в аукционе; документ подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) с отметкой банка; гражданином – копия документа, содержащая его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность; представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица; консолидированными участниками для участия в аукционе представляются также оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Лицо, желающее принять участие в аукционе, обязано подписать с Организатором торгов соглашение, определяющее взаимные права и обязанности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Порядок осмотра объекта осуществляется участником аукциона по согласованию с Организатором торгов.

**Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразившие согласие на предоставление предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязаны:**

- в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся, в размере, определенном соответствующим протоколом аукционных торгов:
  - внести плату за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки внесения платы за земельный участок), возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения.

Информация о затратах доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись, оплата осуществляется на расчетный счет, указанный в протоколе о результатах аукциона либо о признании аукциона не состоявшимся;

- в течение двух месяцев со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обратиться за государственной регистрацией земельного участка, прав на него в Осиповичское бюро Бобруйского филиала республиканского унитарного предприятия «Могилевское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»;
- соблюдать права и обязанности землевладельцев, землепользователей и собственников земельных участков, установленные Кодексом Республики Беларусь о земле;
- осуществлять всякое строительство, расширение, реконструкцию строений и сооружений в соответствии с законодательством;
- обеспечить использование земельного участка в соответствии с целевым назначением и условиями его предоставления

**Аукцион состоится 25 февраля 2025 г. в 12.00 по адресу:**
**г. Осиповичи, ул. Сумченко, 30, каб. №29.**
**Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.30 29.01.2025 г. до 16.30. 21.02.2025 г.**
**(перерыв с 13.00 до 14.00; вых.: суб., вс.) по адресу: г. Осиповичи, ул. Сумченко, 33, каб. 304.**
**Контактные телефоны: +375(2235)66101, +375(29)3999800, +375(33)6075847.**
**Извещение о проведении аукциона опубликовано на сайтах: www gki.gov.by, www.mogilev-region.gov by, www.osipovichi.gov.by, а так же в печатных средствах массовой информации: газета «Звязда» от 29.01.2025 г.**




СВЯТА

# У ПАДНЯБЕСНАЙ «ГУКАЮЦЬ ВЯСНУ»

## У Кітаі сустрэлі 4723-і год

**Канец студзеня на календары, а чарада свят усё працягваецца. У Беларусі не па сезоне сонечна і цёпла, а ў Паднябесную прыйшло Чуньцзэ — Свята вясны. Так рамантычна тут называюць пачатак новага года. У адпаведнасці з кітайскай традыцыяй гады адлічваюцца ад пачатку праўлення Хуан-дзі — з 2698 года да н. э. Такім чынам і атрымліваецца, што сёлета настаў 4723-і.**

Хуан-дзі, або Жоўты імператар, — легендарная асоба, ён лічыцца заснавальнікам дасізму і — ні больш, ні менш — першапродкам усіх кітайцаў. Прынята лічыць, што жоўты колер суадносіцца з характэрным адценнем вады ракі Хуанхэ. Цікава, што гэты колер у Кітаі стаў імператарскім, кіраўнік насіў адзенне залацістa-жоўтага колеру, на спіне звычайна вышываўся залатымі ніткамі іншы сімвал імператарскай улады — лун, які з'яўляецца адначасова і адным з рачных божастваў. Дасюль захаваўся маўзалей Хуан-дзі — месца, дзе быў пахаваны легендарны Жоўты імператар. Паводле легенды, ён узышоў на неба, таму ў маўзалеі захоўваюцца толькі яго адзенне і капялюш.

Штогод дата Чуньцзэ змяняецца, паколькі вызначаецца выключна па месяцава-сонечным кітайскім календары. Адсюль і другая назва — месяцавы Новы год. Пачатак святкавання прыпадае на другі маладзік пасля зімовага сонцастаяння і таму перамяшчаецца ў межах месяца — паміж 21 студзеня і 21 лютага. Сёлета Свята вясны адзначаюць з 29 студзеня.

Падчас Чуньцзэ Паднябесная літаральна расцвітае кумачом. Паўсюль вісяць плакаты з вытанчана выпісанымі на іх іерогліфамі «фу» (шчасце) і «сі» (радасць), гірлянды ліхтароў і іншыя ўпрыгажэнні. І ўсе яны — выключна чырвонага колеру, які азначае поспех і дабрабыт. На дзвярах жыхары налепліваюць парныя каліграфічныя надпісы, выкананыя чорнай тушшу на чырвонай паперы. Змест зводзіцца да выказвання жыццёвых ідэалаў гаспадара дома або



добрых пажаданняў на новы год. На дзверы налепліваюць таксама выявы духаў-ахоўнікаў і бажаства багацця ў надзеі, што яны прынясуць шчасце і дабрабыт.

Жыхары Паднябеснай, мабыць, самыя актыўныя ў свеце карыстальнікі «сусветнага павуціння», таму ўсё часцей лічаць за лепшае віншаваць сяброў і блізкіх анлайн. На змену традыцыйным званкам і паштоўкам прыйшлі паведамленні па месенджары WeChat. Адзін з самых папулярных спосабаў — адпраўка стыкера — анімаванай карцінкі. Часта карыстальнікі сумяшчаюць традыцыйныя пажаданні — кітайскія ідыёмы (чэн'юй) — з пацешнымі малюнкамі або фатаграфіямі знакамітасцяў. Не стаў выключэннем і год Зялёнай Драўлянай Змяі, якая сімвалізуе мір, гармонію, абнаўленне, новыя магчымасці і па праве лічыцца «маленькім драконам».

Навагодняя вячэра адрозніваецца не толькі багаццем і разнастайнасцю страў, але і старадаўнімі традыцыямі. Напрыклад, меню не абыходзіцца без страў з курынага мяса, рыбы і «доўфу» — соевага тварагу (у нас яго называюць «тофу»), бо ў кітайскай мове назвы гэтых прадуктаў сугучныя са словамі, якія азначаюць «шчасце» і «дабрабыт». На Свята прынята абменьвацца падарункамі. Самым распаўсюджаным з'яўляецца чырвоны канверт — «хунбаа». Гэта не толькі грошы, але і пажаданне ўдачы, працвітання іх атрымальніку. З развіццём тэхналогій рабіць такія падарункі стала яшчэ прасцей. Той жа WeChat з 2015 года даў сваім карыстальнікам магчымасць адпраўляць грашовыя «хунбаа» ў асабістыя і публічныя чаты.

Святкаванне кітайскага Новага года заканчваецца маштабным фестывалем ліхтароў, які сёлета адбудзецца 12 лютага. Дарэчы, сустрэлі Чуньцзэ не толькі на яго «радзіме». Яго таксама адзначалі па ўсім свеце, перш за ўсё — у многіх краінах, дзе жыве значная колькасць кітайцаў. Шмат мерапрыемстваў з нагоды Чуньцзэ ладзіцца і ў Беларусі. А ў Кітаі распачаліся вялікія святочныя канікулы, якія працягнуцца больш за тыдзень. Жыхары Паднябеснай «гукаюць вясну».

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.**



Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.

**29 СТУДЗЕНЯ** Даты | **Падзеі** | Людзі




**1878** год — нарадзіўся (г. Мінск) Уладзімір Іванавіч Самойла, беларускі публіцыст, літаратурны крытык, філосаф. Удзельнічаў у беларускім літаратурна-грамадскім руху ў Мінску. Адзін з заснавальнікаў кніжнага таварыства «Мінчук». Пры яго садзейнічанні ў газеце «Северо-Западный край» 28 мая 1905 года быў апублікаваны на беларускай мове верш Я. Купалы «Мужык» — першае выступленне паэта ў друку.

**1919** год — у Віцебску пачаў дзейнасць тэатр рэвалюцыйнай сатыры (існаваў да 1920 года).

**1922** год — у Мінску на базе Навукова-тэрміналагічнай камісіі Наркамасветы БССР створаны Інстытут беларускай культуры (Інбелкульт) — вышэйшая шматгаліновая навукова-даследчая ўстанова, першая ў гісторыі Беларусі. Інстытут існаваў да 1928 года, потым быў перайменаваны ў Беларускую акадэмію навук.




**1616** год — галандскія падарожнікі адкрылі крайні паўднёвы пункт Паўднёвай Амерыкі — мыс Горн. Удача ўсміхнулася купцам Якабу Лемеру і Вілему Схаўтэну. Прычаліўшы 29 студзеня 1616 года да невядомай зямлі, яны адкрылі новы востраў і мыс. Першаадкрывальнікі абмінулі востраў і назвалі яго ў гонар роднага горада і згарэлага карабля — Хорн. Адкрыццё мыса Горн і праліва Дрэйка пачало новую веху ў гісторыі мараплаўства. Тысячы караблёў, гружаных таварамі, накіраваліся па новым шляху.

**1860** год — нарадзіўся Антон Паўлавіч Чэхаў, выдатны рускі пісьменнік, драматург, урач. Аўтар апавяданняў, аповесцяў і п'ес, прызнаны адным з найвялікшых пісьменнікаў у сусветнай літаратуры. Чэхаў стварыў творы, якія сталі класікай сусветнай драматургіі.

**1886** год — нямецкі канструктар Карл Бенц запатэнтаваў аўтамабіль з рухавіком унутранага згарання.

**1896** год — амерыканскі фізік Э. Грубэ першым у свеце выкарыстаў радыеактыўнае выпраменьванне для лячэння раку.

# АЛЁ, НАРОД!..

ВЯСЁЛЫЯ І ЦІКАВЫЯ ГІСТОРЫІ АД ЧЫТАЧОЎ «ЗВЯЗДЫ»

**Вядучая рубрыкі Валянціна ДОЎНАР.**

## ХІТРЫ ЗМІТРА, АЛЕ І САЎКА НЕ ДУРНЫ

Гэта даўняя гісторыя.

Валодзька — як многія і тады, і цяпер — жыў у вёсцы, а на работу ездзіў у горад: аўтобусам, кіламетраў за дзесяць. Кошт білета быў чатырнаццаць капеек, яшчэ тых, савецкіх. Не сказаць, што дорага, а значыць, не збіраўся чалавек ні работу мяняць, ні свой транспарт купляць... Да таго ж аўтапаркі ў тыя гады былі моцныя: з паўсотні аўтобусаў у рэйсы выходзілі, не ламаліся, не спазняліся...

А вось Валодзька няк — ледзьве паспеў: дагнаў у той дзень апошні.

Падышоў да кіроўцы, ляп-ляп па кішэнях, а там — ні капеек, ні драбнейшых купюр. Хіба «заначка» ў службовым пасведчанні.

Выцягнуў дзесяць рублёў, падаў вадзіцелю.

Той паглядзеў на іх, паварушыў медзякі на капоце ў бляшанай каробачцы, — рэшты няма.

— Едзь так, — дазволіў Валодзьку. — У наступны раз аддасі.

У наступны за рулём быў іншы кіроўца, праз дзень — таксама.

«Значыць, за праезд можна і не плаціць?!» — узрадаваўся пасажыр. І з той самай пары кожнаму з новых, незнаёмых яму шафёраў стаў працягваць дзясятку.

Гэта, як правіла — спрацоўвала: кіроўцы, эканомячы дробныя манеты (трэба ж нечым рэшту даваць), дазвалялі пасажыру ездзіць задарма.

Такім чынам (чатырнаццаць капеек на дарозе не валяюцца) Валодзька эканоміў. І амаль штодня!

...Але ж праўду кажуць, што хітры Змітра, але і Саўка не дурны.

Кіроўцы, пагаварыўшы паміж сабой пра багатага пасажыра, які дробных грошай не мае, зразумелі яго махлярства, абышлі суседнія крамы, мяняючы траякі ды пяцёркі на самую дробную «валюту», а потым...

Потым Валодзька ў чарговы раз працягнуў шафёру чырвонец, пачуў яго бурклівае:

— Што, драбнейшых грошай няма?

— Не-а, — пакруціў галавой пасажыр.

— Ну тады пачакай, — адказаў вадзіцель, аднекуль знізу дастаў ладную «торбу» капеек і падаў Валодзьку. — На... Трымай. Пералічы, пакуль не крануліся.

Рабіць гэта — да таго ж перад іншымі пасажырамі — Валодзьку ну ніяк не выпадала! А таму яго эксперымент на гэтым скончыўся і больш ніколі не пачынаўся.

**Віктар Сабалеўскі, г. Узда.**

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 12 781. Індэкс 63850. Зак. № 91.

Нумар падпісаны ў 19.30 28 студзеня 2025 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12